АДКРЫТАЕ ГРАМАДСТВА

В НОМЕРЕ / IN THE ISSUE

Трудно найти более интересную и захватывающую тему для исследования, чем национальная проблематика. Она всегда привлекала исследователей и политиков и является непременным атрибутом серьёзных политологических работ, посвященных странам, осуществляющим переход к демократии и рынку. Слова "нация", "национальная идея", "национальное самосознание", "национальная культура и язык" никого не оставляют равнодушными. Вероятно, это является причиной того, что авторам не всегда удаётся подойти достаточно беспристрастно к рассмотрению проблем, затрагивающих политические аспекты национальных отношений. Одно дело, когда речь идёт, например, об изучении проблемы разделения властей, и совсем другое – когда учёному приходится писать о политике геноцида против собственного народа.

Субъективизм, который сопутствует рассмотрению вопросов национальных отношений, нередко является причиной выбора ошибочной стратегии и тактики в политической борьбе. Нечто подобное, по моему мнению, произошло и у нас в стране в конце 80-х – начале 90-х годов. Белорусов так долго унижали и угнетали на их этнической территории, что, когда создались благоприятные политические условия для артикуляции своих собственных национальных интересов, мы оказались настолько опьянены воздухом свободы, что не сумели избежать одной очень существенной ошибки. Видимо, неслучайно в Древнем Риме существовала пословица: festina lente, что означает – "торопись медленно". Мы переоценили степень готовности народа к восприятию национально-культурных лозунгов, уровень его национального самосознания. Выдвижение на передний план политической борьбы возрождения в качестве первоочередной задачи белорусского языка не принесло ожидаемых дивидендов. Оказалось, что процесс денационализации зашёл настолько далеко, что даже самая образованная и интеллектуально развитая его часть – интеллигенция и элита – в большинстве своём, осталась глуха не только к проблеме возрождения языка, но и, как показала практика, к представившейся возможности строительства собственного национального государства.

Воспользовавшись ошибками, которые допустили белорусские демократы, правящей верхушке удалось сформировать в обществе негативный образ БНФ, представить её лидеров в качестве экстремистов, далёких от повседневных нужд простого народа, которых интересуют проблемы белорусского языка и только. СМИ, подконтрольные властям, немало сделали для того, чтобы понятие "национализм" приобрело только негативный смысл. Ситуация усугублялась тем, что среди демократического движения не было единства в вопросе о государственности белорусского языка. На президентские выборы 1994 года демократы вышли с двумя кандидатами: С.Шушкевичем и З.Пазьняком. В итоге выборы принесли победу типичному выразителю интересов советских белорусов, которые испытывали ностальгию по относительно сытым и размеренно-спокойным брежневским временам и которым колбаса была ближе к сердцу, чем исторический бел-чырвона-белы флаг и государственность белорусского языка.

Сегодня история предоставила белорусским демократам новый шанс, который необходимо использовать для придания белорусскому государству национального характера. Его можно реализовать только посредством победы на предстоящих президентских выборах. Если он будет упущен, то над Беларусью нависнет реальная угроза потери своей государственности. В любом случае, каким бы ни был исход политической борьбы на президентских выборах, белорусское общество нуждается в разработке реалистической программы национального возрождения, которая бы учитывала особенности, присущие белорусской нации.

Данный номер журнала, как и предыдущий, является тематическим. Читатель, видимо, уже догадался, что он посвящён проблеме взаимодействия демократии и национализма в современной Беларуси. Редакция надеется, что материалы номера окажутся полезными не только партийным активистам и политикам, но и преподавателям общественных дисциплин, и студентам, а также всем тем, кто интересуется новейшей историей Беларуси и неравнодушен к судьбе собственной страны.

Михаил ПЛИСКО,
главный редактор
журнала "Открытое общество"

“Я НЕ ДУМАЮ, ЧТО НАМ НАДО ОТКАЗАТЬСЯ ОТ ИДЕИ СОЗДАНИЯ НАЦИОНАЛЬНОГО ГОСУДАРСТВА”

Интервью кандидата философских наук, политолога Владимира РОВДЫ главному редактору журнала “Открытого общества” Михаилу ПЛИСКО

Плиско М.К.: Владимир Викторович, существуют различные концепции возникновения наций. Одни полагают, что нации существуют, по крайней мере, со времён средневековья, другие считают их продуктом буржуазных революций и развития капиталистических отношений. А что говорит современная наука по этому поводу? Не могли бы Вы изложить своё видение этой проблемы?

Ровда В.В.: Есть две основные и противоположные друг другу концепции происхождения наций. Одна из них основывается на теории премодернизма, что, мол, нации существовали всегда, в том числе, например, и в древнем Египте. Есть исследователи, которые считают, что на территории Великого Литовского княжества существовала нация литвинов и что именно она позднее трансформировалась в белорусскую нацию. Главным недостатком этой концепции является смешение двух понятий – “нации” и “этноса”. Этносы возникли на очень раннем этапе развития человечества, ещё в первобытном обществе. В основе их лежала общность культуры и определённая организация социальной жизни людей. Принадлежность человека к этносу в те времена не требовала от него самоосознания этого факта. Это была объективная данность. В отличие от нации, этносы не имеют политической компоненты, т.е. они не ставят перед собой политических задач и не стремятся к созданию своих собственных этнических государств. Фактически до XVIII века мир не знал национальных государств. Наций как таковых в природе не существовало. Существовали или многонациональные империи, в которых какой-либо один этнос занимал доминирующее положение, или небольшие государственные образования, своеобразные полисы, в средние века – это города-государства, которые не включали в свой состав всех представителей этноса.

Наиболее распространённой и общепризнанной теорией возникновения наций является теория, получившая наименование “модернизации”. Наиболее полно и детально она была сформулирована ныне покойным учёным Эрнстом Геллнером, перу которого принадлежит несколько книг и десятки статей по проблемам наций и национализма. Он утверждал, что нации являются продуктом модернизации или осовременивания. Модернизация – это многогранное и очень ёмкое понятие. Она включает в себя процесс перехода от традиционного общества к современному и в первую очередь – урбанизацию и развитие рыночной экономики. В ходе модернизации формируется совершенно новая социальная организация общества, появляются новые социальные группы и классы. Общество становится менее замкнутым, более подвижным, мобильным и коммуникабельным. Таким образом, процессы модернизации общества объективно влекут за собой процесс национальной интеграции, формирование национального сообщества людей, которое получает название нации. Эти национальные сообщества характеризуются тремя основными признаками. Во-первых, это общность культуры, которая заимствуется от этноса, на базе которого возникает сама нация. Во-вторых, это фактор политической воли. Без воли к единству, объединению нация может и не состояться. Носителем этой воли является национальная интеллигенция, элита общества. Именно она разрабатывает концепцию национального объединения и обосновывает необходимость этого объединения. Базой для неё являются события национальной истории, общность культуры и близость языка. Так постепенно у людей вырабатывается чувство патриотизма и осознание своей национальной принадлежности. Объективным фундаментом интеграционных процессов являются рыночные отношения, которые приводят к постепенному стиранию культурных и языковых различий между родственными этническими группами, возникновению литературного языка и единой системы национального образования. И, наконец, у формирующейся нации возникает необходимость в политическом самоопределении. Наиболее приемлемой формой этого самоопределения является национальное государство, во главе которого должны стоять представители своей собственной нации. Этого, кстати, не было в донациональный период. Тогда во главе государств могли стоять монархи, которые принадлежали к династиям других государств. С формированием национальных государств рычаги власти стали принадлежать представителям нации. В жизнь была воплощена идея французского национального государства. Эта же идея нашла своё воплощение в конце XVIII века в лозунге, который сформулировал Томас Джефферсон и который в видоизменённом виде дожил до сегодняшнего дня: “Америка для американцев”.

Плиско М.К.: Вы сказали, что в мире не было национальных государств до XVIII века. Но ведь в Англии буржуазная революция произошла в середине XVII века. Можно ли говорить, что в этой стране процесс формирования британской нации совпал с революцией и формированием буржуазных отношений?

Ровда В.В.: XVIII век был назван мною в качестве некоего рубежа и только. На самом деле процесс возникновения национальных отношений носил длительный и эволюционный характер. Одни элементы вызревали раньше, другие – позже. Особенно значительную роль в формировании протонациональных движений сыграл протестантизм, так как он поощрял частную инициативу людей и одним из его лозунгов было требование перевода библии на национальные языки. Кстати, ведь и Статут Великого Литовского княжества был написан на старобелорусском языке.

Если говорить об Англии, то здесь, по моему мнению, качественный скачок в формировании именно национального государства произошёл уже после упомянутой революции, которая носила характер религиозной войны и которую многие исследователи справедливо называют пуританской революцией. Политическая революция, по настоящему открывшая дорогу развитию рыночных отношений и передаче власти в руки выборных представителей нации, произошла позднее и получила название “славной революции”. Завершила процесс образования в Англии единого национального рынка и государства промышленная революция второй половины XVIII века. Именно она собрала воедино ранее разрозненные части страны и сыграла роль своеобразного национального тигеля. Затем процесс формирования национальных государств захватил Францию, США, во второй половине XIX века – Германию, Италию, страны Южной Европы, а в начале XX века – Центральную и Восточную Европу. Интересно отметить, что первоначально большевики поддержали национальные движения в России, национализм угнетённых наций и усиленно пропагандировали лозунг о праве нации на самоопределение вплоть до отделения и образования самостоятельного государства. Но после захвата власти, они отказались от него и в так называемом равноправном союзе национальных республики на деле эти союзные республики не располагали никакими реальными правами.

Плиско М.К.: По моему мнению, процесс возникновения национальных государств в XX веке проходил в менее благоприятных политических и геополитических условиях. Становлению новых национальных государств противились их более мощные в экономическом и военном отношении соседи, так как это вело к пересмотру существующих границ. На этой почве возникали территориальные споры, которые в отдельных случаях заканчивались войнами. Считаете ли Вы, что наличие огромного числа национальных и этнических конфликтов приводит к дискредитации национально идеи и национализма?

Ровда В.В.: И да, и нет. С одной стороны, это так. Действительно, до недавнего времени мы жили в мире с устоявшимися границами, однако распад СССР привёл к изменению геополитической ситуации, что создало в Центральной и Восточной Европе благоприятные условия для нового этапа национального движения. Некоторые западные политики с опаской восприняли процесс возникновения новых национальных государств. К счастью, в большинстве случаев их возникновение носило мирный характер и осуществлялось демократическим путём. Но, не везде. В Югославии, например, дело дошло даже до этнических чисток.

Национальная идея – обоюдоострое оружие. Ею могут пользоваться как демократы, так и недемократы. Она – мощнейшее оружие по силе воздействия на людей. Распад старой политической системы и крах коммунистической идеологии, которая выступала в роли своеобразного интегратора, привели к атомизации общества в посткоммунистических странах. Поскольку политический и идеологический плюрализм не могут появиться в одночасье, то на начальных стадиях трансформации посткоммунистических обществ только национализм наряду с религиозным фундаментализмом мог выступить в роли интегративного фактора. Об этом очень аргументировано писала известный польский исследователь Ядвига Станишкис. В большинстве стран национализм использовался для быстрого проведения демократических реформ. После укрепления политических партий и разнообразных общественных организаций, проведения рыночных реформ, появления среднего класса и завершения процесса формирования гражданского общества национализм утрачивает своё прежнее значение, как бы засыпает. Он проявляется в активной политической форме только тогда, когда возникает угроза национальной независимости, национальной культуре и т.д.

Плиско М.К.: Владимир Викторович, давайте теперь поговорим о формировании и развитии белорусской нации. Можно ли сказать, что белорусская нация существовала во времена Великого Литовского княжества? Если нет, то когда, по Вашему мнению, начала формироваться белорусская нация и в каких условиях происходило её развитие?

Ровда В.В.: В научном понимании говорить о начале формирования белорусской нации можно только со второй половины XIX века, хотя предпосылки для её формирования были заложены в предшествующий период. Именно тогда начался процесс формирования национальной интеллигенции. Вспомним имя Ф.Богушевича, его творчество и деятельность по развитию белорусского языка и культуры. Очень важное место в развитии белорусской нации занимает так называемый “виленский” период. Это годы издания в начале XX века журнала “Наша Ніва”. Вокруг “Нашай Нівы” объединилась целая плеяда выдающихся общественных и политических деятелей, литераторов, немало сделавших для разработки белорусской национальной идеи. Трудность становления национализма в Беларуси заключалась в аграрном характере её экономики. У нас не было городов, которые можно было бы считать индустриальными центрами, таких, например, как Рига, Киев, Варшава, Петербург. В принципе в большинстве стран Центральной и Восточной Европы была примерно схожая ситуация. В этих странах носителем национальной идеи выступает, как правило, сельская интеллигенция. Это придаёт национализму этих стран аграрный характер. В Чехии, например, городская культура была немецкоязычной и именно она доминировала на территории проживания чешского этноса. В этой стране процесс индустриализации совпал с развитием чешского национального движения, что и привело после падения Австрийской империи к созданию независимого чехословацкого государства. Аналогичным образом развивался процесс в странах Балтии, хотя, например, Эстония по уровню развития национальной культуры в то время уступала Беларуси. В трудных условиях проходило развитие национальной культуры и языка и в Латвии, где во многих городах большинство жителей составляли русские и евреи и где были сильные традиции немецкой культуры. Но главное, что они имели и что способствовало укреплению этих национальных государств – это сохранение ими независимости вплоть до начала Второй мировой войны.

У нас же, после распада Российской империи сложилась неблагоприятная политическая ситуация. После кратковременного периода существования БНР Беларусь оказалась под властью большевиков, которые вынуждены были пойти на создание БССР. На практике они оказались не меньшими русификаторами, чем деятели царского правительства. Не следует забывать и том, что в 20-30-е гг. белорусы оказались на положении разделённого народа. Западная часть белорусских земель оказалась под властью Польши, а на Востоке хозяйничали большевики. В Западной Беларуси по отношению к белорусам польское правительство проводило жёсткую политику полонизации, особенно по отношению к белорусам-католикам, белорусская культура и язык подвергались преследованиям и ограничениям. В советской части Беларуси, после укрупнения БССР и кратковременного периода “белоруссизации”, начала проводиться политика русификации. Под флагом борьбы с так называемой нацдемовщиной начался процесс физического уничтожения белорусской интеллигенции, в первую очередь, творческой. В сталинских лагерях погибло то поколение белорусской интеллигенции, которое позднее могло придать мощь и силу белорусской национальной идее. Позитивным фактором можно считать формальное сохранение своей государственности, пусть даже и в очень урезанном виде. Это можно отнести к достижениям белорусского национального движения. В начале 90-х гг. сохранение статуса союзной республики способствовало провозглашению независимого государства и признанию его со стороны России.

Если говорить о послевоенном развитии белорусской нации, то оно проходило также в крайне неблагоприятных условиях. Несмотря на то, что Беларусь была в числе победителей над фашистской Германии и даже соучредителем ООН, она понесла территориальные потери. От Беларуси были отторгнуты

Белостокская область и Виленский край. Отрицательно сказались на развитии нации и людские потери. Ведь Беларусь потеряла в войне каждого третьего своего жителя.

В отличие от многих союзных республик процесс индустриализации и урбанизации в Беларуси не сопровождался формированием в городах белорусскоязычной среды и национально ориентированной интеллигенции и элиты. В городах, несмотря на приток белорусскоговорящих жителей из сельской местности, разговорным языком остался русский язык. Давление со стороны русскоязычных было настолько сильным, что сельские жители, попав в город, переходили на русский язык и постепенно утрачивали "сваю родную мову". Это свидетельствует о том, что у нас не смогла сформироваться достаточно развитая городская белорусская культура.

Политику, которую в 50-80-х гг. проводило местное коммунистическое руководство, особенно при Машерове, с полным основанием можно назвать антинациональной и антибелорусской и это полностью устраивало Москву. Не случайно, находясь с визитом в Минске, Никита Хрущёв сказал, что белорусы первыми вступят в коммунизм, так как они все заговорили на русском языке. В отличие от нас в республиках Прибалтики местные коммунисты старались защищать национальную культуру своих народов и поддерживали свою интеллигенцию. Это было характерно и для Западной Украины.

Когда в начале 90-х гг. Беларуси представился шанс создать своё национальное государство, она из-за слабости белорусской национальной идеи и неразвитости национального самосознания так и не смогла реализовать его в полной мере. На мой взгляд, сегодня Беларусь нельзя назвать национальным государством, так как руководство нашей страны не проводит политику, направленную на укрепление белорусской культуры и языка, не защищает в должной мере национальные интересы страны. Скорее эту политику можно назвать антинациональной, так как она направлена против белорусского народа и может привести к поглощению нашего государства со стороны России. Это парадоксальная ситуация, так как с одной стороны сейчас мы имеем благоприятные политические условия для укрепления белорусской нации, которых никогда прежде не имели, а с другой стороны, такой русификации, которую мы наблюдаем сегодня, не было, наверное, даже при коммунистах.

Плиско М.К.: Так может быть мы уже бесповоротно опоздали и нам уже не удастся переломить ход событий, т.е. сохранить белорусскую нацию. И, вообще, можно ли говорить, что белорусская нация существует. Некоторые исследователи и политики считают, что процесс формирования белорусской нации не завершен и будет ли он завершён ещё неизвестно?

Ровда В.В.: Нет, я считаю, что процесс формирования белорусской нации завершился в 30-х годах. Другое дело, что ей присущи некоторые особенности, которые обуславливает её внутреннюю слабость. Ей не хватает того, что Л.Гумилёв называл пассионарностью. Это происходит из-за того, что нации недостаёт критической массы интеллигенции и элиты, осознающей свою белорусскость. Но то, что такая нация существует, у меня нет ни какого сомнения. Правда, можно сказать, что в Республике Беларусь, благодаря стараниям её руководства, она находится на положении национального меньшинства, по отношению к которому проводится политика дискриминации и порабощения.

В своё время белорусские демократы недооценили слабость белорусской национальной идеи, слабость белорусской нации. В 1991 году они попытались действовать так, как действовали демократы в прибалтийских республиках. И не удивительно, что у них ничего не получилось. У нас национальная идея не стала средством артикуляции интересов гражданского общества. В силу её слабости она не должна была выдвигаться оппозицией на первый план в политической борьбе. Решить задачу создания национального государства можно только посредством завоевания политической власти. О том, как это можно сделать и должны сегодня думать национально-ориентированные демократы. И если на первый план политической борьбы вновь будут выдвинуты культурные задачи, то мы опять проиграем. Нам необходимо разработать реалистическую программу возрождения белорусской нации и последовательно, шаг за шагом воплощать её в жизнь.

Плиско М.К.: Не могли бы Вы назвать хотя бы несколько пунктов такой программы?

Ровда В.В.: Первое и самое главное - это победа демократического кандидата на предстоящих президентских выборах. Предвыборная кампания должна проходить под лозунгами социально-экономического содержания. Затем проводятся свободные и демократические выборы в полномочный парламент, который утверждает программу белоруссизации. Причём мы не должны повторить ошибки первой половины 90-х гг., когда на белорусский язык обучения переводилась начальная школа и даже детские сады. Начать надо с системы высшего образования. Надо, чтобы вначале по-белорусски заговорила интеллигенция и элита общества. Тогда за ними потянутся и другие слои общества. Именно по такому пути идёт Украина и мы должны использовать её опыт. Думаю, что на реализации подобной программы потребуется не более десяти лет.

Плиско М.К.: Владимир Викторович, Вы говорили, процесс превращения этноса в нацию характеризовался ломкой региональных перегородок и локальных культурных различий. Такие процессы можно наблюдать и сейчас. Например, сегодня полным ходом идёт объединение Западной Европы, Северной и Центральной Америки, такие же интеграционные процессы идут и в других частях мира. Так может быть белорусам и не стоит суетиться с решением задачи создания своего национального государства? Ведь в недалёком будущем, возможно, придётся объединяться с другими нациями и государствами? Да и, вообще, быть может, скоро и сами нации исчезнут?

Ровда В.В.: В том, что нации могут исчезнуть, нет ничего антинаучного и необычного. Это проявление законов диалектики, по которым идёт развитие природы и общества. Объединительные процессы, которыми охвачены передовые страны мира, свидетельствует о том, что мир вступил в новую стадию модернизации - стадию постиндустриального и информационного общества. Очевидно и то, что интеграционные процессы ведут к ослаблению роли национальных государств. Некоторые функции, которые им присущи, передаются наднациональным органам управления. Но нельзя не заметить, что одновременно с объединительными процессами можно наблюдать усиление процессов регионализации и рост национального сепаратизма. Причем, это происходит и в развитых странах Европы, таких как Бельгия, Германия, Британия, Италия, Испания, а также в Канаде. Поэтому, я не думаю, что нам надо отказаться от идеи создания национального государства. Сегодня никто не сможет сказать точно, сколь продолжительной будет новая стадия модернизации и чем она завершится. В качестве превентивной меры можно было бы уже сейчас принять программу развития английского языка, так как именно он становится языком межнационального общения.

Плиско М.К.: Спасибо Вам, Владимир Викторович, за содержательное и интересное интервью и успехов в Вашей работе.

Генадзь ПРАНЕВІЧ,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

МЭНТАЛІТЭТ У СІСТЭМЕ КААРДЫНАТ НАЦЫЯНАЛЬНАГА БЫЦЬЦЯ

"Чалавек – гэта тое, што ён спажывае", – афарыстычна заўважыў неяк нямецкі філосаф Г. Лейбніц.

"Чалавек – гэта тое, дзе і ў якіх умовах ён нарадзіўся і жыве", – дадасьць не філосаф і таксама будзе мець рацыю.

"Чалавек – гэта тое, што ён думае і як ён дзейнічае" – падоўжыць рад гэтых азначэньняў нехта трэці і зробіць свой унёсак у характарыстыку мэнталітэту… Так, менавіта мэнталітэту – паняцьця, якім мы звычайна карыстаемся, калі патрабуецца акрэсліць адметнасьць, спецыфічную своеасаблівасьць, самасьць пэўнага суб'екта гістарычнага працэсу – чалавека, этнасу, нацыі, пэўнай этнаграфічнай групы людзей ці нават цэлай расы.

Калі зьвесьці да нейкай сумы шматлікія назіраньні вучоных і тыя вызначэньні, якія даюць энцыклапедычныя даведнікі, дык мэнтальнасьць (ад лац. mens – уяўленне, розум) – гэта сьветабачаньне, адмысловы, адметны спосаб мысьленьня і стаўленьня пэўнага этнасу альбо папуляцыі да жыцьця і рэчаіснасьці, якія вынікаюць з цэлага шэрагу фактараў, такіх як прыродна-геаграфічныя асаблівасьці і ўмовы жыцьцядзейнасьці, прырода, клімат, рэлігія, гістарычны вопыт і г.д.

Заўважым у дадатак, што мэнталітэт – фактар гістарычна ўстойлівы, кансэрватыўны, бо грунтуецца на базавых архетыпах падсьвядомага нацыянальнага "я", зь якіх складаецца адмысловая матрыца сьветаадчуваньня і этыкі паводзін асобнага чалавека і цэлага народа, якая перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне ўсёй плыньню жыцьця – генэтычна, праз выхаваньне, культуру, мастацтва, бытавы і гаспадарчы ўклад і г. д. І ў той жа час – рухомы, зьменьлівы, залежны ад канкрэтных прыродных, гістарычных, сацыяльна-палітычных умоў існаваньня этнасу.

Складаныя праблемы, з якімі сутыкнулася беларускае грамадзтва ў працэсе этнічнай і гісторыка-культурнай самаідэнтыфікацыі, пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы і рынкавай эканомікі, відавочны разрыў паміж дэмакратычнай элітай і масай, паміж пасіянарнай часткай грамадзтва і яе інэртнай большасьцю, цяжкасьць паразуменьня прымушаюць больш пільна прыглядзецца да духоўных асноў нацыянальнага характару і мэнтальнасьці беларусаў, шукаючы найперш тут разгадку нязвыклай, часта парадаксальнай рэакцыі народа і асобных сацыяльных груп насельніцтва на рэаліі сучаснага сьвету, узаемадачыненьні з уладай, палітычнымі рухамі і г.д. У самую пару задумацца і над такім пытаньнем: наколькі палітычная ідэалогія дэмакратычнага руху ўлічвае асаблівасьці беларускага мэнталітэту і ці надае яму належнае месца ў палітычных тэхналогіях.

1. ПАНЯЦЬЦЕ АБ БАЗАВЫМ МЭНТАЛІТЭЦЕ: ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ НАЗІРАНЬНІ

Для ацэнкі дынамікі мэнтальнай сфэры, зьмен, якія ў ёй адбываліся і адбываюцца, не абысьціся без такога паняцьця, як *базавы мэнталітэт*, зь якім мы звычайна атаясамліваем талерантнасьць, памяркоўнасьць, традыцыйны кансэрватызм беларусаў.

Прырода беларускага нацыянальнага мэнталітэту ў значнай ступені вызначаецца фактарам універсальнай *прыродна-геаграфічнай, геапалітычнай* і *цывілізацыйна-культурнай* прамежкавасьці ці, як слушна лічыць А.Мальдзіс, сярэдзіннасьці альбо эўрацэнтрызму беларускага этнасу [1]. На гэтыя акалічнасьці некалі зьвярталі ўвагу такія выдатныя вучоныя, філосафы і мысьліцелі эпохі Рэнесансу, як Ф.Скарына, М.Гусоўскі, С.Будны, а ў XIX-XX ст.ст. – А.Міцкевіч, Ф.Багушэвіч, Я.Купала, Я.Колас, М.Гарэцкі, І.Канчэўскі, А.Смоліч і інш.

Можна назваць яшчэ некалькі важнейшых фактараў, якія паўплывалі на фармаваньне гэткай адмысловай беларускай мэнтальнасьці: 1) геаграфічна-ландшафтныя і прыродна-кліматычныя асаблівасьці тэрыторыі Беларусі; 2) геафізічны склад глебаў і біясфэры; 3) сацыяльна-гаспадарчы ўклад жыцьця.

Вытокі талерантнасьці, прырода памяркоўнага, неканфліктнага характару беларусаў карэняцца, відаць, ужо ва ўмераных прыродна-кліматычных умовах жыцьця, у пераходным ад поўначы да поўдня характары флоры і фаўны, мяккім раўнінна-ўзгоркавым рэльефе і лясіста-балоціста-палявым ландшафце, у якіх выявілася складаная прыродна-геаграфічная разнастайнасьць і шматаблічнасьць акаляючага нас сьвету, яго супярэчлівасьць і адзінства, натуральна ўраўнаважаныя і пагоджаныя ў агульным прыродна-кліматычным балансе Беларусі.

Яшчэ ў большай ступені на ўсталяваньне талерантнасьці як нормы паводзін і этыкі ўзаемаадносін паміж людзьмі і народамі паўплывалі, аднак, умовы і асаблівасьці гістарычнага і сацыяльна-палітычнага жыцьця беларускай нацыі, сярод якіх важнейшую ролю адыграў якраз геапалітычны фактар – эўрацэнтрычнае месцазнаходжаньне Беларусі на перасячэньні шляхоў з Усходу на Захад і з Поўначы на Поўдзень, па так званым былым шляху "из варяг в греки", што абумовіла тут, як шчыльнае ўзаемадзеяньне і суіснаваньне культур рознай рэлігійна-этнічнай і духоўнай арыентацыі: усходняй і заходняй, каталіцка-пратэстанцкай і візантыйска-праваслаўнай, іудзейскай і ісламскай, – так і перманентную ўключанасьць краю ў кола стратэгічных ваенна-палітычных і эканамічных інтарэсаў народаў і краін Эўропы і нават Азіі [2].

Прыкладам, А.Міцкевіч ў сваім курсе славянскіх літаратур, чытаным ў Калеж дэ Франс у Парыжы, так пісаў пра гістарычны лёс Літвы-Беларусі: "Нарманы і ляхі прыходзілі сюды са сваёй уладай, і схіляліся яны то пад скіпетрам рускіх князёў, то пад уладай Польшчы. З той пары, калі іх заваяваў дом Рурыка, яны былі ў складзе рускіх земляў… Тут сутыкалася каталіцкая рэлігія з усходняй царквой, шляхецкая Рэч Паспалітая з сістэмай самаўладства…" [3].

Жыцьцёвая неабходнасьць падтрыманьня складанай раўнавагі, балансу featureрознахарактарных і рознанакіраваных сіл і ўплываў (комплекс Шаляў), у сфэры якіх нязменна аказваўся беларускі народ на працягу сваёй тысячагадовай гісторыі, як і ўвогуле кансэрватыўна-ахоўны статус цэнтра, на наш погляд, і паслужылі асновай талерантнасьці беларусаў як сьветапогляду і своеасаблівай філасофіі жыцьця.

Надзвычай разьвіты інтэграцыйны складнік беларускага нацыянальнага характару, выяўлены ў філасофіі і этыцы талерантнасьці, абумоўлены, такім чынам, не толькі ўзьдзеяньнем эўрацэнтрычных фактараў, павышанай камунікатыўнасьцю і цікавасьцю беларусаў да вонкавага сьвету, але і абмежаванымі мажлівасьцямі для разьвіцьця і эмансыпацыі свайго ўласнага нацыянальнага "эга", зьвязаны з філасофіяй выжываньня, пастаяннай неабходнасьцю залагоджваньня "чужога" як неабходнай умовай самазахаваньня.

Пераважна з гэтых пазіцый варта разглядаць і ацэньваць утварэньне дзяржаўнай канфэдэрацыі паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польскім Каралеўствам, замацаванае актам Люблінскай уніі 1569 года падчас Лівонскай вайны з Масковіяй. У значнай ступені тое ж датычыцца і Брэсцкай уніі 1596 года паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі.

Нездарма здольнасьць да сацыяльна-этнічнай мімікрыі, падладжваньне пад моцнага і дужага дзівосным чынам спалучаюцца ў беларусаў з так званым "комплексам ваўка", які характарызуецца выключнай любоўю да роднай зямлі, прывязанасьцю да родных мясьцін, адданасьцю традыцыям свайго роду-племені і гатоўнасьцю бараніць сваю зямлю і ўласныя сама-

бытныя духоўна-этычныя і маральныя пачаткі, выяўленыя ў натуральных прынцыпах дабра, праўды, справядлівасьці.

Аналізуючы дамінантныя фактары беларускай мэнтальнасьці, асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на спецыфічны працэс станаўленьня беларускай нацыі, наяўнасьць у ім дзьвюх гістарычных фазаў разьвіцьця, калі, пачаўшы фарміравацца яшчэ ў фэўадальную эпоху па класічным эўрапейскім тыпе, маючы сваёй асноўнай сацыяльнай базай буйных магнатаў, шляхту, гараджан, яна ў выніку рэалізавалася ў новым часе (XIX-пачатак XX ст.ст.) ужо як нацыя сялянская паводле сваёй асноўнай сацыяльнай дамінанты.

Страта элітарных слаёў, узрастаньне ролі мужыцка-сялянскіх пачаткаў істотна паўплывалі на характар і зьмест беларускай нацыянальнай мэнтальнасьці, пазначанай на гэтым этапе большай кансэрватыўнасьцю сацыяльна-палітычнага мысьленьня, абачлівасьцю і асьцярожнасьцю, характэрнымі для сялянскага класа.

Адначасна гэты працэс суправаджаўся паглыбленьнем і замацаваньнем у рэестры нацыянальных каштоўнасьцяў такіх традыцыйных рысаў сялянскага сьветапогляду, як любоў і прывязанасьць да свайго кутка зямлі, гаспадарлівасьць, ашчаднасьць, працавітасьць, цярплівасьць, адданасьць сям'і і сямейна-родавая салідарнасьць, усьведамленьне магчымасьцяў і межаў уласнай свабоды.

У гэты перыяд складаецца своеасаблівы тып мэнтальнасьці, цесна спалучаны з ідэяй выжываньня і самазахаваньня народа. Нездарма ў літаратуры і мастацтве гэтага перыяду амаль культавай увагай карыстаюцца вобразы ваўкоў альбо ваўкалакаў як своеасаблівых татэмаў-прабацькоў, закліканых вытлумачыць мэнтальнасьць беларусаў як народа ляснога, земляробча-аседлага, гаспадарлівага, накрэпка прывязанага да свайго жытла, сям'і, роднага кутка, адпорнага і стойкага ў вайне, асабліва пры абароне сваёй зямлі.

Згодна з гэтай мэнтальнасьцю беларусы не любяць пакідаць родныя мясьціны. Лічылася ледзь не амаральным, калі чалавек прадаваў сваю хату альбо сядзібу. З пагардай і недаверам ставіліся ў вёсках да прымакоў, што не мелі свайго кутка, хаты і прыходзілі на жончыну гаспадарку. Ці да тых перакінчыкаў, што лёгка спакушаліся на чужыя ласункі і прынады.

Успомнім радкі выдатнага нацыянальнага паэта Ф.Багушэвіча:

"Ад чужога хлеба губы абсядаюць,
Што чужога прагнуць, то сваё кідаюць.
Я не кіну хаты, хоць вы мяне рэжце.
Не пайду да вас я, хіба ў арэшце.
А хоць сілай навет адарвалі б з дому,
Калісьці вярнуўся б, як мядзьведзь да лому.
Заваліцца й хата, зарастуць пакосы,
Усё б я вярнуўся, хоць голы да босы" [4].

Такім чынам, мэнтальнасьць не містыка, а аб'ектыўны і вельмі сур'ёзны фактар, які падлягае ўліку і ацэнцы пры выпрацоўцы стратэгіі і тактыкі дэмакратычных пераўтварэньняў, правядзеньні сацыяльных і рынкавых рэформаў, прыняцьці адказных палітычных і гаспадарчых рашэньняў.

Паказальна, што ў былым СССР вывучэньне мэнтальных асаблівасьцяў шматлікіх народаў было пастаўлена на салідную навуковую аснову, а іх вынікі выкарыстоўваліся для правядзеньня адпаведнай нацыянальнай палітыкі.

Так, па сьведчаньні вучоных-эколагаў, у часы халоднай вайны ў СССР рабіліся спробы растварыць і зьнішчыць беларускі этнас, паколькі Беларусь разглядалася як плацдарм для магчымых ваенных дзеяньняў з Захадам, у сувязі з чым яе тэрыторыю меркавалася зрабіць своеасаблівым выпрабавальным палігонам. Для рэалізацыі задачы патрэбна было пературыць тубыльцаў у дэнацыяналізаванае насельніцтва, якое не пачувала б сябе гаспадаром на ўласнай зямлі і было б не ў стане прадухіліць рэалізацыю адпаведных планаў. Таму карэнных жыхароў (пераважна моладзь) мэтанакіравана адпраўлялі на ўдарныя камсамольскія новабудоўлі, у шахты Данбаса, на цалінныя землі, адначасова замяшчаючы іх на Беларусі вызваленымі з турмаў крымінальнікамі – выхадцамі з розных куткоў былога СССР.

Аднак эксперымэнт не зусім ўдаўся: масавай дэградацыі і разлажэння этнасу не адбылося. Большасьць новапрыбылых, асвоіўшыся на новым месцы, праз колькі гадоў не толькі выпраўляліся, станавіліся нармальнымі людзьмі, больш за тое – беларусамі, набывалі тутэйшы мэнталітэт, прымалі жыцьцёвую філасофію тубыльцаў.

Праведзеныя Міністэрствам абароны СССР у 70-х гг. сакрэтныя дасьледаваньні далі сэнсацыйныя вынікі: адказнай за правал была прызнана сама зямля Беларусі, у глебах якой (зразумела, што і ў прадуктах харчаваньня) адсутнічаюць ці знаходзяцца ў вельмі малой колькасьці такія элемэнты, як цынк, бор, селен, ёд, што адказваюць за працэсы ўзбуджэньня кары галаўнога мозгу. У выніку ў пэўнай часткі новапрыбылых з часам падаўлялася празьмерная агрэсіўнасьць, нэрвова-псіхічная неўраўнаважанасьць, якія, як вядома, штурхаюць людзей на канфлікты і злачынствы.

Няма асаблівай патрэбы тлумачыць, што названыя тут прыродныя і біяфізічныя фактары складаюць пэўныя перадумовы для фармаваньня асаблівага тыпу нацыянальнага характару і мэнтальнасьці беларусаў, з якіх вынікае крыху меланхалічны, нясьпешны, спакойна-разважлівы спосаб паводзін і адносін да жыцьця і рэчаіснасьці. Яшчэ на пачатку XVI стагодзьдзя на гэтыя рысы характару і мэнтальнасьці жыхароў роднага краю зьвярнуў увагу паэт-лацініст М.Гусоўскі, алегарычна ўвасобіўшы свой гераічны рыцарскі народ у вобразе расліннаежнага волата пушчанскіх лясоў – зубра:

"Зубр для людзей не страшны: не чапай – не зачэпіць,
Будзе стаяць як укопаны – пастыр на варце,
Не страпянецца, а позіркам пасціць няспынна
І чараду, і сям'ю ў чарадзе на папасе,
Ды і любую пагрозу ўласнай бяспецы" [5].

Ідэал мірнага воіна-абаронцы ляжыць і ў аснове скарынавага запавета неагрэсіўнага, але адпорнага нацыянальнага суіснаваньня з іншымі людзьмі і народамі, які асьветнік сьцьвярдзіў на аснове аднаго з важнейшых пастулатаў хрысьціянскай этыкі: "… то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хощеши от иных имети" [6].

Паказальна аднак, што ўжо ў тую эпоху пачынае ўсьведамляцца адносны характар філасофіі талерантнасьці, каштоўнасьць якой залежала ад канкрэтных гістарычных умоў і непасрэдных нацыянальна-дзяржаўных задач, з якімі сутыкалася краіна.

Так, калі ў пачатку XVI стагодзьдзя М.Гусоўскі яшчэ паэтызаваў міралюбнасьць зубра-рыцара ("не чапай – не зачэпіць"), яўна атаясамліваючы ягоны прыродны нораў з характарам свайго народа, дык ужо ў другой палове XVI–XVII стст. залішняя прыродная мяккасьць, рахманасьць, падатлівасьць ліцьвінаў ва ўмовах агрэсіўнага наступу Польшчы і Масковіі пачынаюць усьведамляцца як недахоп, як адна з прычын дзяржаўна-палітычнага заняпаду Вялікага княства Літоўскага.

У гэтым сэнсе надзвычай паказальны погляд на мэнталітэт беларусаў выдатнага пісьменьніка-публіцыста другой паловы XVI стагодзьдзя Філона Кміты-Чарнобыльскага, які, аналізуючы ў сваіх "Допісах" агрэсіўны характар палітыкі і дзеяньняў суседзяў, з горыччу пісаў: "Давно резать почали литвина, и тот де, с прыроженя натуры на себе сам необачное… просто як овца: где их больш берет волк, там оне дальше за ним идут! Большы будет жычлившый народу польскому, нижели своему! Ова просто есмо як рыба в омуте:слепи, неведоми! Не ведаем, куды в сию есмо диру влезли" [7].

Як бачым, гэтую больш як чатырохсотгадовую характарыстыку лёгка прымерыць да стану сучаснага беларускага грамадзтва, што пераканальна сьведчыць аб устойлівасьці некаторых зыходных рысаў базавага мэнталітэту.

Трэба аднак улічваць, што алгарытм нацыянальнага разьвіцьця ў роўнай ступені абапіраецца на дзьве разнавіднасьці нацыянальнага мэнталітэту і спосабу гістарычнага дзеяньня. Адвеку ў нашым народзе суіснавалі як бы два тыпы, дзьве разнавіднасьці ці, дакладней, якасьці нацыянальнага характару: цьвёрдасьць і мяккасьць, падатлівасьць і маўклівая, зацятая ўпартасьць, цярплівасьць і адчайны, гераічны радыкалізм. Пры гэтым у залежнасьці ад канкрэтнай сітуацыі паступальны гістарычны прагрэс нацыі адбываўся як праз гераічны радыкалізм, так і праз ахоўны кансэрватызм і памяркоўны лібералізм.

Ствараецца ўражаньне, што менавіта суіснаваньне і цеснае ўзаемадзеяньне гэтых двух тыпаў нацыянальных паводзін якраз і забясьпечваюць унутраную жыцьцёвую устойлівасьць беларускай нацыі, яе здольнасьць жыць і выжываць на скрыжаваньнях эўрапейскай і сусьветнай гісторыі.

Цікава, што, распрацоўваючы ў свой час план "Барбароса" – вайны з Савецкім Саюзам, – немцы недастаткова адэкватна ацанілі гэтую мэнтальную асаблівасьць нацыянальнага характару, ахарактарызаваўшы беларусаў як памяркоўны, мяккі, рахманы народ, які лёгка здымаецца з месца, схільны да падарожжаў і г.д., і ў выніку атрымалі ў сваім тыле ў часе апошняй вайны паўмільённую армію партызан, якія адчайна змагаліся за сваю зямлю, родныя хаты і сям'і супраць акупацыйнай палітыкі карных аперацый у дачыненьні да мірнага насельніцтва і прымусовага вывазу моладзі на работы ў Германію.

У цэлым жа, безумоўна, мы – народ, гістарычная дзейнасьць і палітычная воля якога выяўляюцца на мяжы цярпеньня, у экстрэмальных сітуацыях, цяжарных класічным "альбо-альбо".

Гэта значыць, што пры дамінаваньні ў нацыянальным жыцьці этыкі талерантнасьці і палітычнай ідэалогіі кансэрватызму гістарычнае разьвіцьцё нацыі адбываецца праз пасіянарныя штуршкі-прарывы, якія ўносяць у філасофію нацыянальнага жыцьця істотныя папраўкі і карэктывы. Асобныя з іх, такія, напрыклад, як знакамітая фраза К.Каліноўскага "Тады дажджэшся, народзе, старасьці спакойна, калі над табой ужо маскаля не будзе" ("Пісьмо з-пад шыбеніцы"), альбо не менш слынныя заклікі Я.Купалы "паверыць сіле – збавіцельцы ад усіх мук", дабівацца "поўнай дзяржаўнай незалежнасьці", якая адна толькі і можа даць нашаму народу "і праўдзівую свабоду, і багатае існаваньне, і добрую славу" (артыкул "Незалежнасьць"), яшчэ і сёньня выконваюць у жыцьці народа функцыю нацыянальнага запавета.

Дарэчы, пасля распаду Рэчы Паспалітай гэтыя пасіянарныя штуршкі паўтараліся з зайздросным пастаянствам амаль праз кожныя трыццаць гадоў: 1794 г. – паўстаньне Т.Касцюшкі; лістападаўскае паўстаньне 1830-31 гг.; паўстаньне 1863 г. пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага; адраджэнскі рух пачатку XX стагодзьдзя. У савецкі час гэтыя штуршкі папросту мікшыраваліся перманентнымі рэпрэсіямі і войнамі, аднак падзеі апошніх 10 гадоў засьведчылі, што пасіянарны патэнцыял народа не вычарпаны і мае тэндэнцыю да ўзрастаньня і пашырэньня на розныя сацыяльныя колы і пласты беларускага грамадзтва, уключаючы нацыянальна арыентаваную наменклатуру.

2. "ЗРУШАНЫ" МЭНТАЛІТЭТ: ДЭГРАДАЦЫЯ ЦІ ПАСІЯНАРНЫ ЎЗДЫМ?

Зыходзячы з вядомай тэорыі Л.Гумілёва, мэтазгодна задаць пытаньне: чакае беларусаў неўзабаве эпоха новага пасіянарнага ўздыму (як у часы ўзьнікненьня і росквіту Вялікага княства Літоўскага), зьвязанага з працягам этнагенэзу (ролю мутагенных фактараў адыгралі тут узмоцненая саветызацыя і русіфікацыя насельніцтва, міграцыйныя працэсы, міжнацыянальныя шлюбы і г.д., а апошнім часам – імклівая эўрапеізацыя жыцця), ці канчатковая дэградацыя, абумоўленая мутацыямі эколага-тэхнагеннага і сацыяльнага плана, якія закранулі прыродныя базісныя асновы традыцыйнага нацыянальнага мэнталітэту.

Сярод гэтых новых мутацыйных фактараў, якія Беларусь перажыла напрыканцы XX стагодзьдзя (у апошнія трыццаць гадоў), можна вылучыць наступныя:

1. Чарнобыль і наступствы глабальнага радыяцыйнага забруджваньня, якія закранулі практычна ўсю нацыю, унеслі пачасту неабарачальныя зьмены ў генатып чалавека і механізм спадчыннасці;

2. Катастрафічныя экалагічныя зрухі ў прыродзе, выкліканыя меліярацыяй, злачыннай хімізацыяй сельскай гаспадаркі, якія пацягнулі за сабой масавую дэградацыю глебаў, зьмену біясфэры і прыродных ландшафтаў;

3. Радыкальная урбанізацыя вясковага насельніцтва;

4. Інфармацыйны выбух;

5. Глабалізацыя жыцьця.

Пры гэтым неабходна зазначыць, што біясацыяльныя мутацыі – з'ява неадназначная: яны альбо вядуць да поўнай дэградацыі і выраджэньня этнасу, спараджаюць монстраў, альбо ствараюць механізмы адаптацыі і прыстасаваньня да новых умоў жыцьця, спрыяюць выпраўленьню збоеў і паломак у сістэме.

Карацей кажучы, этнас павінен альбо загінуць, альбо адрадзіцца праз мутацыйную карэкцыю, зьмену некаторых, гістарычна (прыродна) абумоўленых рысаў традыцыйнай мэнтальнасьці і новы пасіянарны ўздым.

Першае і самае істотнае, што вынікае з аналізу катастрафічных пагроз, што ўзьніклі на пераломе тысячагодзьдзяў, – неабходна пазбавіцца фаталізму і абыякавасьці ў дачыненні да ўласнага лёсу. Больш самачыннасьці і веры ва ўласныя магчымасьці і сілы. Традыцыйнае беларускае "няхай", "само зробіцца" больш не можа гарантаваць нашай прысутнасьці ў сьвеце. Да гэтага часу (нават ва ўмовах татальнай русіфікацыі і саветызацыі) задачу самаідэнтыфікацыі, узнаўленьня і перадачы базавых рысаў (архетыпаў) нацыянальнай мэнтальнасьці незалежна ад нашых намаганьняў выконвала сама прырода, традыцыйны вясковы ўклад жыцьця, захаваныя на сялянскім падворку саха, мова і песьня, – яны прадукавалі з пакаленьня ў пакаленьне традыцыйны тып беларуса. Пасля Чарнобыля, меліярацыі, калектывізацыі, урбанізацыі, якія радыкальна зьмянілі характар, умовы і спосаб жыцьця папуляцыі, асноўнымі крыніцамі ўзнаўленьня базавага мэнталітэту застаюцца геапалітычны фактар, культура, мова, гістарычная памяць.

Другое. Сёння Беларусь перажывае неймаверныя сацыяльна-палітычныя, псіхалагічныя, маральныя перагрузкі і стрэсы, якія выкліканы вострым канфліктам "зрушанай", тыранічна прышчэпленай савецкай мэнтальнасьці і новых цывілізацыйных каштоўнасьцяў дэмакратыі і гуманізму, носьбітам якіх з'яўляецца найбольш пасіянарная частка грамадзтва – моладзь, навуковая і творчая інтэлігенцыя, прадстаўнікі бізнэсу. Задача заключаецца ў стварэнні прымальнай палітычнай ідэалогіі, якая магла б аб'яднаць канфліктуючыя групы грамадзтва на аснове гуманістычных каштоўнасьцяў нацыянальнага мэнталітэту (перш за ўсё базавага ўзроўню) праз уключэньне насельніцтва краіны ў працэс нацыянальна-культурнай і гістарычнай самаідэнтыфікацыі дзеля глыбейшага пазнаньня саміх сябе і вызначэньня перспектывы ўласнага гістарычнага разьвіцьця.

3. МЭНТАЛІТЭТ ЯК АБ'ЕКТ ПАЛІТЫЧНАЙ ІДЭАЛОГІІ: МАНІПУЛЯЦЫІ І СЬПЕКУЛЯЦЫІ

Нацыянальны мэнталітэт, які ўяўляе сабой складаную каштоўнасна-арыентацыйную сфэру сучаснага чалавека, з'яўляецца адным з важнейшых складнікоў і аб'ектаў палітычнай ідэалогіі дзяржавы, палітычных партый і рухаў разнастайнай арыентацыі, па-за якім вельмі цяжка ўявіць сабе выпрацоўку сучаснай стратэгіі і тактыкі грамадзкіх пераўтварэнняў, правядзеньне сацыяльных і рынкавых рэформаў, прыняцьце адказных палітычных і гаспадарчых рашэньняў.

Вядома таксама, што веданьне нацыянальнай псіхалогіі і мэнтальнасьці, адчуваньне падсьвядомай мэнтальнай сфэры, зьвязанай з інстынктамі, стэрэатыпамі мысьленьня і паводзін, фобіямі і сурагатамі бытавой сьвядомасьці значна пашыраюць (асабліва ў часе выбарчых кампаній) магчымасьці палітычнага прагназаваньня, выбару аптымальных шляхоў і сродкаў дасягненьня пастаўленых мэтаў, робяць палітычную дзейнасьць палітычных партый і грамадзкіх лідэраў унутрана матываванай, асэнсаванай.

Калі гаварыць пра стаўленьне да гэтага фактару беларускіх палітыкаў, дык, як ні дзіўна, давядзецца прызнаць тут пэўныя "посьпехі" найперш за кіруючым рэжымам.

Найперш зазначым, што і В.Кебіч і А.Лукашэнка (ці тыя, хто планаваў і кантраляваў гэты працэс ужо на стадыі фармаваньня перадвыбарчай платформы тагачаснага кандыдата ў прэзідэнты ў 1994 г.), выключна ўдала сыгралі на талерантнасьці і традыцыйным кансэрватызме настрояў выбаршчыкаў, стомленых настальгіяй і падзеньнем жыцьцёвага ўзроўню насельніцтва пасьля распаду СССР.

Прыгадаем, што ўжо ў часы В.Кебіча ідэалагічнае ведамства Ул. Замяталіна для камуфляжу сваёй дэструктыўнай антынацыянальнай дзейнасьці ў пары з традыцыйнымі лозунгамі аб інтэрнацыянальным брацтве і дружбе з вялікім рускім народам узмоцнена рэкламавала і ўхваляла як узор талерантнасьці падатлівасьць і пластычнасьць беларускага нацыянальнага характару, што ва ўмовах перадвыбарчай кампаніі мела на мэце падоўжыць летаргію беларускага нацыянальнага жыцьця, закансэрваваць здавальняючы кіруючую эліту стан палітычнай самасьвядомасьці народа, каб захаваць статус-кво, выгадны ёй расклад палітычных сіл і, вядома ж, уладу. Пад прыкрыцьцём змаганьня за талерантнасьць улада фактычна праводзіла ранейшую камуністычную палітыку дэнацыяналізацыі, якая абярнулася для беларускага грамадзтва руйнаваньнем і вынішчэньнем самабытных асноў нацыянальнага жыцьця, культуры і мовы народа і, як высьветлілася пазьней, рыхтавала глебу пад сумнавядомы рэферэндум 1995 года аб наданьні рускай мове статуса другой дзяржаўнай і аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, што фактычна паклала пачатак новай унутранай акупацыі краіны.

Што датычыць А.Лукашэнкі, дык нельга не адзначыць яго асьцярожнага абыходжаньня з так званым комплексам "мірнага воіна", які вынікае з мэнтальных рысаў беларускага нацыянальнага характару. Аглядка на гэты комплекс пастаянна прысутнічае ў палітычнай ідэалогіі і дзеяньнях А.Лукашэнкі. Нават прымаючы актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, што вынікаюць з Дамовы аб калектыўнай бясьпецы краін СНД, і выступаючы іншы раз з надзвычай рызыкоўнымі ініцыятывамі, накшталт стварэньня сумеснай трохсоттысячнай беларуска-расійскай ваеннай групоўкі, ён кожны раз суправаджае свае дзеяньні абяцаньнямі не пасылаць салдат у гарачыя кропкі.

Паводле назіраньняў, ідэалагічныя маніпуляцыі і сьпекуляцыі мэнтальнымі асаблівасьцямі нацыянальнага характару з мэтай прышчапіць, укараніць у падсьвядомасьць народа патрэбныя ідэалагемы альбо навязаць выгадныя палітычныя сцэнарыі, ацэнкі і рашэньні становяцца адным з самых распаўсюджаных сродкаў барацьбы рэжыма з апазіцыяй.

Трэба прызнаць, што рэжым досыць пасьпяхова сьпекулюе на частых ваяжах і апэляцыях апазіцыйных сёньняшняму рэжыму палітыкаў да Захаду, абвінавачваючы іх у непатрыятызме і добра ведаючы, што ў адпаведнасьці з даўняй, укаранёнай у народзе звычкай "не выносіць сьмецьце з хаты, а спрэчак на людзі" такія дзеяньні не знойдуць у насельніцтва асаблівай падтрымкі і спачуваньня. "Ліхая тая птушка, што ў сваё гняздо паскудзіць", – прыпомніць народную прымаўку неспакушаны глядач БТ і зробіць "свой" вывад аб "барацьбітах за народнае шчасьце".

Зьвернем увагу і на такі факт, што нават безьліч разоў высьмеяная ў незалежных СМІ "трасянка" А.Лукашэнкі ў спалучэньні з актыўнай барацьбой з "нацыяналізмам" яшчэ зусім нядаўна прыносіла яму значна больш палітычных дывідэндаў, чым бездакорная беларуская мова яго больш адукаваных палітычных апанентаў, бо аб'ектыўна працавала на імідж так званага "народнага прэзідэнта", як бы сьведчыла аб ягонай большай блізкасьці да простага народа.

Такім чынам, справа не толькі ў абсалютнай манаполіі Лукашэнкі на электронныя сродкі масавай інфармацыі ці ў нейкай надзвычайнай харызматычнасьці (З.Пазьняк і С.Багданкевіч не менш пасіянарныя і харызматычныя асобы), але ў яго ўнікальных прыроджаных якасьцях маніпулятара, інтуітыўнай альбо сьвядома прагназуемай палітычнай гульні на кансэрватыўных рысах беларускага мэнталітэту, заснаванага на імкненьні да стабільнасьці і раўнавагі.

Пралікі на гэтым фронце самога Лукашэнкі толькі пацьвярджаюць важнасьць уліку заканамернасьцяў разьвіцьця і функцыянаваньня мэнтальнай сфэры, ігнараваньне якіх пагражае адчувальнымі палітычнымі паразамі. Прыгадаем хоць бы, як на самым піку папулярнасьці не былі падтрыманы насельніцтвам экстрэмісцкія заклікі Лукашэнкі аб байкоце парламенцкіх выбараў 1995 г., а ўжо ў 2000 г., на фазе вычарпаньня кансэрватыўных чаканьняў і надзеяў выбаршчыкаў, не мелі абсалютна ніякага выніку ягоныя звароты і заклікі да электарата прыйсьці на выбары ў "мёртвую палатку". А які рашучы адпор атрымала палітыка дэнацыяналізацыі і захады па зьнішчэньні беларускай мовы, аб чым яскрава можна меркаваць па выніках апошняга перапісу насельніцтва Беларусі?!

Гэтыя факты сьведчаць найперш пра тое, што і ва ўмовах татальнай ідэалагічнай "прамыўкі мазгоў" базавыя архетыпы нацыянальнай мэнтальнасьці застаюцца ўстойлівымі і жыцьцяздольнымі, а інстынкт самазахаваньня ва ўмовах крызісу абвастраецца.

Чатыры гады – гэта натуральны межавы тэрмін эксплуатацыі і дзеяньня любой палітычнай ідэалогіі, своеасаблівы рэсурс, на які яна можа існаваць, асабліва не клапоцячыся пра падмацаваньне якімі-кольвек адчувальнымі рэальнымі вынікамі. Далей пачынаецца непазбежны перыяд яе кансэрвацыі, дэградацыі і гібелі. Для рэжыму А.Лукашэнкі гэты перыяд пачаўся з 1999 года. Лічыльнік уключаны – і можна толькі назіраць, як мітусіцца перад крэдыторамі спалоханы вінавайца, прыцісьнуты неабходнасьцю плаціць па пазыках.

Праўда, цяжка сказаць, ці зможа апазіцыя нешта скарыстаць з гэтых новых мажлівасьцяў. Яе ранейшыя палітычныя дзеяньні ў гэтым напрамку сьведчаць аб выключнай сьхільнасьці да экспромтаў, а практычны досьвед зусім невялікі. Можна прыгадаць хіба што колішнюю распрацоўку Ул. Падголам ідэалагемы "Наш дом – Беларусь", але яна, на жаль, не знайшла ў дэмакратычным асяродзьдзі таленавітых пасьлядоўнікаў і папулярызатараў. Гэта сьведчыць пра тое, што ў цэлым дэмакратычная апазіцыя недастаткова ўлічвае ў сваіх акцыях, палітычнай ідэалогіі і прагнозах фактар нацыянальнага мэнталітэту і яго асноўных складнікоў, слаба валодае гэтым разьдзелам палітычнай барацьбы, стаўкай у якой з'яўляецца лёс і будучыня народа.

4. "ВЫБАРЫ – 2001" І БЕЛАРУСКАЯ ПЕРСЬПЕКТЫВА Ў НОВЫМ СТАГОДЗЬДЗІ

Прагноз на новае стагодзьдзе ў значнай ступені залежыць ад адказу на пытаньне: якая палітычная ідэалогія, палітыкі якога тыпу будуць запатрабаваныя на новы перыяд?

Калі зыходзіць з факту пасіянарнага ўздыму 90-х гадоў (маецца на ўвазе ўздым нацыянальна-патрыятычнага руху 1989-94 гг. і ірацыянальны псеўдасацыялістычны рэнесанс Лукашэнкі 94-99 гг.), дык, згодна з алгарытмам нацыянальнага разьвіцьця, нас павінен чакаць перыяд стабілізацыі, пошуку рацыянальных прагматычных падстаў нацыянальнага жыцьця, якія павінны прывесьці беларускае грамадзтва ў стан раўнавагі на аснове рэабілітацыі і аднаўленьня традыцыйных каштоўнасьцяў базавага мэнталітэту.

90-я гады, як вядома, мелі патрэбу ў лідэрах радыкальнага тыпу (З.Пазьняк, А.Лукашэнка). У абодвух выпадках іх лідэрства было прадвызначана найперш комплексам нацыянальнай непаўнавартаснасьці, які праваказаўся, з аднаго боку, даведзеным да крайнасьці савецкім абскурантызмам у дачыненьні да гісторыі, мовы, культуры і нацыянальнай самабытнасьці беларусаў і Беларусі (З.Пазьняк). Запатрабаванасьць жа Лукашэнкі тлумачыцца настальгіяй значнай часткі электарата па страце Беларусьсю былога лідэрства і прывілегіяванага становішча ў былым СССР, а таксама абясцэньваньнем ва ўмовах пасля распаду СССР ідэалагемы пра асаблівы ўклад і героіка-трагедыйную ролю краіны і беларускага народа ў вайне СССР з фашысцкай Германіяй, на якой было выхавана і з якой душой зраслося старэйшае пакаленьне.

НАЦИОНАЛИЗМ И ПРАКТИКА ПОЛИТИЧЕСКОГО ПРОЦЕССА

Як паказаў перыяд прэзідэнцтва А.Лукашэнкі, сацыяльна-палітычнае абслугоўваньне і забесьпячэньне гэтых надзвычай ідэалагізаваных каштоўнасьцяў савецкага кшталту аказалася для дзяржавы непасільным цяжарам. Трэба ўлічваць таксама, што два пасіянарныя штуршкі, якія беларусы перажылі на працягу 90-х гадоў, у выніку жорсткага сутыкненьня і канфрантацыі палярных ідэалогій (нацыянальна-патрыятычнай і савецка-камуністычнай), узаемна дэкампенсавалі і сур'ёзна абясцэнілі прапанаваныя грамадзтву каштоўнасьці і мадэлі разьвіцьця, аб'ектыўна прывялі да ўнутранай і вонкавай палітычнай ізаляцыі носьбітаў і лідэраў гэтых ідэалогій, палітычны рэсурс якіх аказаўся істотна падарваны. У выніку ніводзін з традыцыйных палітыкаў, што прадстаўляюць гэтыя палітычныя плыні, не мае на сёньня колькі-небудзь рэальных шанцаў на перамогу ў прэзідэнцкіх выбарах 2001 года.

Ва ўмовах, калі ў грамадзкай думцы Беларусі канца мінулага – пачатку новага стагодзьдзя ясна абазначыўся прыярытэт рацыянальных, прагматычных фактараў над рамантызмам самых прывабных і спакушальных ідэалагем, патрабуецца кардынальная пераарыентацыя палітычнай ідэалогіі на якасна іншыя мэнтальныя каштоўнасьці, якія могуць быць запатрабаваныя ў самай недалёкай перспектыве.

Спрабуючы неяк асэнсаваць цяперашні актуальны стан народа, інтуітыўна сьпеючыя ў ім новыя жаданні і патрэбы, публіцыст А. Казловіч у сваім нядаўнім эсэ "Высокая гара" выявіў іх у імператыве "Беларусы, сядайце на сваю зямлю!", якім засьведчыў, што ва ўмовах сістэмнага крызіса, які перажывае краіна, у грамадзкай сьвядомасьці адбываецца інтуітыўны, стыхійны паварот да ідэй памяркоўнага ліберальна-дэмакратычнага і нацыянальна-адраджэнскага кшталту, зьвязаных з разьвіцьцём індывідуальнай ініцыятывы і самадзейнасьці насельніцтва, абуджэньнем у народзе пачуцьця гаспадара, з усьведамленьнем матэрыяльна-прагматычнай і духоўнай каштоўнасьці роднай прыроды і ўласнага гістарычнага быцьця, унікальнай каштоўнасьці народнай культуры і самога беларускага мэнталітэту, што дасталіся нам у спадчыну ад продкаў [8].

Сёньня, калі ў беларускім грамадзтве паступова высьпявае і фармуецца цалкам новая парадыгма нацыянальнага мысьленьня, у аснове якой ляжыць прагматычны нацыянальны інтарэс, а маладое пакаленьне ўсё больш настойліва заяўляе аб сваіх памкненьнях да эканамічнай свабоды, рынка і дэмакратыі, праяўляе зацікаўленасьць ў рэалізацыі праграмаў малой і сярэдняй прыватызацыі, у міжнародных праектах эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва з эўрапейскімі краінамі, варта згадаць і пра тыя агромністыя інтэграцыйныя магчымасьці, якія вынікаюць з эўрацэнтрычнага становішча Беларусі, традыцыйнай адкрытасьці і чуласьці яе насельнікаў да ўздзеяньня агульнаэўрапейскіх геапалітычных, эканамічных і духоўных фактараў.

Таму што ня толькі сваімі трактарамі, калійнымі ўгнаеньнямі, інтэлектам і кваліфікаванай працоўнай сілай, але найперш перспектывай пабудовы ў цэнтры кантынента надзейнага і трывалага эўрапейскага маста з Захаду на Усход і з Поўначы на Поўдзень, унікальным нацыянальным мэнталітэтам, талентам залагоджваць, яднаць і здружваць людзей, народы, культуры і рэлігіі прывабныя і цікавыя мы сваім славянскім і балтыйскім суседзям, усёй Эўропе, urbi et orbi.

Да выкананьня гэтай інтэграцыйнай эўрапейскай ролі Беларусь прыгатавана ўсёй сваёй папярэдняй гісторыяй, паколькі менавіта тут адвеку праходзіла цывілізацыйная мяжа паміж эўрапейскім рыма-каталіцкім Захадам і праваслаўна-візантыйскім Усходам. Тут у часы Ф.Скарыны і С.Буднага зазналі пару росквіту эўрапейскі гуманізм і пратэстантызм, сфарміраваліся і дзейнічалі сістэма саслоўна-прадстаўнічай дэмакратыі і інстытуты прававой дзяржавы, а гандлёвыя шляхі і культурныя кантакты краіны дасягалі самых далёкіх куткоў тагачаснай Эўропы.Тут напрацоўваўся ўнікальны вопыт сумеснага жыцьця і неканфліктнага суіснаваньня розных народаў, рэлігій, культур, людзей розных нацыянальнасьцяў і веравызнаньняў. У талерантнасьці як духоўнай аснове нашага быцьця найбольш яскрава і пасьлядоўна выявіліся сэнс і зьмест нашай нацыянальнай ідэі, якая сфармавалася ўжо ў XVI стагодзьдзі, а на рубяжы XVIII-XIX ст.ст. аказалася цалкам сугучнай марам лепшых эўрапейскіх мысьліцеляў аб аб'яднанай Эўропе.

Палітычныя рэальнасьці цяперашняга часу такія, што ўпершыню за доўгія стагодзьдзі талерантнасьць, якая была заўсёдным прадметам нашага нацыянальнага гонару перад зьнешнім сьветам і адначасна ўнутранай драмай нашага ўласнага жыцьця, стала крыніцай нацыянальнай нявызначанасьці, раз'яднанасьці і проста слабасьці... Тая самая талерантнасьць можа стаць сёньня крыніцай нашай сілы і кансалідацыі ў выпадку, калі ўдасца акумуляваць у сваім нацыянальным разьвіцьці тыя магутныя памкненьні да міжнароднай каапераціі, інтэграцыі і супрацоўніцтва, якія востра адчуваюць практычна ўсе эўрапейскія краіны і народы.

Менавіта таму насуперак мэтанакіраванай самаізаляцыі цяперашняга рэжыму ад цывілізаванага свету, насуперак "дикому крену на Восток" і наменклатурнаму беларуска-расейскаму саюзу, што абслугоўвае інтарэсы дзяржаўна-палітычных кланаў па абодва бакі ад нафта-газавых і гарэлачных калектараў, перадвыбарная Беларусь чакае выпрацоўкі такога курса, які поруч з аднаўленьнем поўнага нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту краіны замацуе ў сваім палітычным вектары вялікую мару нашых суайчыньнікаў аб аб'яднанай Эўропе ад Атлантыкі да Урала, Эўропе без войнаў, межаў і мытняў, без разьдзяляльных ліній і палітычных бар'ераў. Пра такую новую Эўропу марылі некалі Вальтэр і наш вялікі суайчыньнік А.Міцкевіч, які натхнёна клікаў той час, "калі народы, забыўшыся пра спрэчкі, адзінаю сям'ёй у свеце стануць жыць".

Гістарычны парадокс нашага нацыянальнага быцьця заключаецца ў тым, што Беларусь можа атрымаць свой шанц для поўнай і канчатковай самарэалізацыі ў якасьці самастойнага і паўнапраўнага суб'екта міжнароднай супольнасьці толькі ў рамках агульнага руху да аб'яднанай Эўропы ў выніку адаптацыі і пашырэньня эўрапейскіх цывілізацыйна-прававых стандартаў на ўвесь кантынент. Шмат чаго ў гэтым працэсе будзе залежаць ад актыўнасьці і пасіянарнасьці самой Беларусі, якая ў XXI стагодзьдзі можа стаць адроджаным Хрыстом Эўропы праз спаўненьне перад людзкасьцю і сьветам той наканаванай нам ад Бога місіі быць злучальнікам, мастом паміж іншымі людзьмі, народамі, культурамі, дзеля якой мы пакліканы ў сьвет і якая дадзена нам мэнтальна ў выглядзе нашай уласнай нацыянальнай ідэі.

ЗАЎВАГІ

1. Мальдзіс А. Беларуская культура барока як пасрэдніца паміж заходнеславянскім і ўсходнеславянскімі сьветамі. Мн.: "Навука і тэхніка", 1993, с.4-6.
2. Праневіч Г. Гістарычныя формы дэмакратыі і самакіравання на Беларусі. // Да дэмакратыі праз грамадзянскую супольнасць. Шчэцін, 1999, с.72-73.
3. Mickiewicz A. Dzieia. T.VII. Literatura siowiacska. Warszawa. 1955, c.106.
4. Багушэвіч Ф. Творы. Мн.: "Мастацкая літаратура", 1991, с.28.
5. Гусоўскі М. Песня пра зубра. Мн.: "Мастацкая літаратура", 1973, с.16.
6. Скарына Ф. Творы. Мн.: "Навука і тэхніка", 1990, с.62.
7. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн.: "Навука і тэхніка", 1975, с.87.
8. Казловіч А. Высокая гара. Беларусы паміж небам і зямлёй. // "Народная воля", 7 сакавіка 2001 г.

Алесь СМАЛЯНЧУК,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

БЕЛАРУСКІ РУХ ПАЧАТКУ XX СТ. І ІДЭЯ ПАЛІТЫЧНАЙ НАЦЫІ

З'яўленне ідэі палітычнай нацыі ў грамадскім і палітычным жыцці Беларусі і Літвы непарыўна звязана з феноменам т.зв. краёвасці пачатку XX ст. Асноўным пастулатам краёвай ідэалогіі было сцвярджэнне, што ўсе карэнныя этнасы Беларуска-літоўскага краю ўтвараюць адзіную нацыю, якую часта называлі "нацыяй ліцвінаў". Да гэтай нацыі належыць кожны, хто адчувае сябе грамадзянінам Краю, незалежна ад этнічнасці, сацыяльнага паходжання і культурнай арыентацыі.

Ідэалогія краёвасці выразна супрацьстаяла этнічнаму нацыяналізму. Яна нарадзілася сярод літоўскіх і беларускіх палякаў, свядомасць якіх зачастую вызначалася формулай gente Lithuaniae, natione Polonus альбо gente Ruthenus, natione Polonus. Першымі з прапагандай краёвых поглядаў у друку выступілі Раман Скірмунт (Glos przeszlosci i potrzeba chwili. Lwow, 1905), Баляслаў Ялавецкі (Litwa i jej potrzeby… Narodowy katechizm Litwy. Petersburg, 1905), Міхал Ромэр, Канстанцыя Скірмунт і інш.

Адзінства ў разуменні краёвай ідэі не было. Краёвасць Міхала Ромэра прадугледжвала зліццё ўсіх карэнных этнасаў Краю і фармаванне новай палітычнай нацыі. Раман і Канстанцыя Скірмунты ўспрымалі краёвасць як беларуска-літоўскі патрыятызм, дамінаванне агульнакраёвых інтарэсаў над патрэбамі асобных этнасаў і сацыяльных груп. Для Людвіка Абрамовіча краёвая ідэалогія зводзілася да добрасуседскага сужыцця ўсіх этнасаў Краю. У масавай свядомасці большасці прадстаўнікоў мясцовай польскай грамадскасці, якая падтрымала краёўцаў, краёвасць трактавалася чыста прагматычна як тактычны сродак дзеля ўмацавання польскасці ў перыяд нацыянальна-культурнага Адраджэння народаў Краю. Пры гэтым рознагалоссі ўсе краёўцы ўспрымалі Беларуска-літоўскі край як суб'ект гісторыі і працавалі над яго ператварэннем у суб'ект палітыкі. Іх палітычная канцэпцыя эвалюцыянавала ад патрабавання аўтаноміі "гістарычнай Літвы" з сеймам у Вільні да яе дзяржаўнай незалежнасці [1].

Першыя кантакты беларускіх дзячоў з краёўцамі адбываліся ўжо ў часы рэвалюцыі 1905-1907 гг. У № 46 ад 13 (26).04. 1906 г. "Gazety Wilenskiej", кіраўніком якой з'яўляўся Міхал Ромэр, быў надрукаваны артыкул Антона Луцкевіча, прысвечаны аграрнай праграме Беларускай Сацыялістычнай Грамады ("Program agrarny"). А.Луцкевіч схаваў сваё аўтарства пад псеўданімам "Ян Мялешка".

Кантакты прыкметна ўзмоцніліся ў 1910 г., калі ў Вільні ўзнікла масонская ложа "Лучнасць", сярод заснавальнікаў якой былі браты Луцкевічы. Гэтая ложа аб'ядноўвала прадстаўнікоў дэмакратычных плыняў польскага, беларускага, літоўскага, яўрэйскага і рускага этнасаў. Большасць з іх падзяляла краёвыя погляды. У 1911 г. у "Лучнасць" быў прыняты Міхал Ромэр, які хутка стаўся адным з прызнаных масонскіх кіраўнікоў [2]. Дзякуючы ягоным асобасным якасцям, уменню пераканаць і павесці за сабой віленскія масонскія ложы (у 1911 г. была створана ложа "Літва", у 1914 г. – ложа "Беларусь") сталі моцнымі цэнтрамі прапаганды краёвасці і ідэі палітычнай нацыі ў якасці яе найважнейшай складовай часткі [3].

Аналіз публікацый Антона і Івана Луцкевічаў дазваляе сцвярджаць, што ў гэты перыяд дзеячы беларускага руху падзялялі асноўныя пастулаты краёвасці. Магчыма, паслярэвалюцыйная палітычная рэакцыя, якую звычайна звязваюць з дзейнасцю вядомага расійскага рэфарматара і кіраўніка ўрада Пятра Сталыпіна, разуменне ўнутранай слабасці палітычнага беларускага руху спрыялі адыходу ягонага кіраўніцтва ад пэўнага сацыяльнага і этнічнага радыкалізма. Можна сцвярджаць, што ў перыяд з 1907 па 1916 г. адбывалася лібералізацыя беларускага руху і перамяшчэнне галоўнага акцэнта дзейнасці з палітыкі на культурна-асветніцкую галіну. Кіраўнікі беларускага руху (браты Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі) не толькі прынялі ідэю палітычнай нацыі, але і актыўна яе прапагандавалі.

Адным са сродкаў такой прапаганды стала выданне братамі Луцкевічамі штодзённай рускамоўнай "Вечерней газеты". Першы нумар выйшаў 18.09. (1.10). 1912 г. Прапаганда краёвасці і ліберальна-дэмакратычнай ідэалогіі, якую разгарнула "Вечерняя газета", адыграла сваю ролю падчас абрання ўдзельнікаў віленскага губернскага выбарчага сходу па т.зв. "рускай курыі". Газета, сапраўды, паспрыяла распаўсюджванню сярод рускай грамадскасці Вільні ідэй ліберальных дэмакратаў. Гэта паўплывала і на вынікі выбараў. Адначасова высветлілася, што газета знайшла свайго чытача. І Антон Луцкевіч вырашыў працягваць выданне. Магчыма, ужо ў гэты час у яго ўзнік план цэнтралізацыі віленскага дэмакратычнага і краёвага друку, пра які пазней спамянуў у сваім дзённіку М.Ромэр [4].

Істотнай часткай гэтага плана было выданне штодзённай польскамоўнай газеты. Гэты праект А.Луцкевіч збіраўся рэалізаваць ў цесным кантакце з польскімі дэмакратамі. Аднак перамовы з групай польскіх віленскіх дэмакратаў-краёўцаў (галоўным апанентам А.Луцкевіча быў Л.Абрамовіч) закончыліся безвынікова. Беларусы вырашылі дзейнічаць самастойна.

8(21).12.1912 г. выйшаў першы нумар "Кур'ера краёвага". Яго рыхтаваў Язэп Манькоўскі, які даволі актыўна ў гэты час працаваў у асяроддзі віленскіх беларусаў, а праграмны артыкул напісаў Антон Луцкевіч [5]. М.Ромэр досыць высока ацэньваў узровень публіцыстыкі першых нумароў "Кур'ера". Галоўнай прычынай поспеху новай "польскай" газеты ён лічыў ідэйнае кіраўніцтва з боку Антона Луцкевіча і непасрэдны ўдзел беларускага дзеяча ў падрыхтоўцы яе нумароў да выдання. У сваіх ацэнках "Кур'ера" М.Ромэр неаднаразова звяртаў увагу на ролю А.Луцкевіча: "Адным з галоўных, хоць звонку непрыкметных супрацоўнікаў газеты з'яўляецца Антон Луцкевіч, адзін са стаўпоў "Нашай Нівы". Гэта, магчыма, самы дзелавіты работнік і самая здольная галава беларускага народнага руху. Адначасова ён рэдагуе "Вечернюю газету". Антон Луцкевіч трымаецца трохі ў цяню, не становіцца на чале "Кур'ера краёвага", але фактычна выконвае партыю першай скрыпкі. Ён аказвае рашаючы ўплыў на кірунак і арганізацыю газеты" [6].

Такім чынам напрыканцы 1912 г. пад кантролем віленскага беларускага кола знаходзіліся чатыры выданні: два беларускіх штотыднёвіка – "Наша Ніва" і "Саха", адно польскамоўнае – штодзённая газета "Кур'ер краёвы" і адно рускамоўнае – штодзённая "Вечерняя газета".

Што сабой уяўляла пазіцыя гэтых выданняў па асноўных пытаннях жыцця Беларуска-літоўскага краю?

У праграмных артыкулах першых нумароў "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага" А.Луцкевіч сфармуляваў галоўныя задачы выданняў, якія цалкам адпавядалі дэмакратычнаму варыянту краёвасці і адвяргалі канцэпцыю этнічнага нацыяналізма.

"Вечерняя газета" № 1 ад 18.09. (1.10). 1912 г.: "У нас ніякім чынам нельга зыходзіць з інтарэсаў якой-небудзь адной нацыянальнай групы. Ва ўмовах разнастайнасці нацыянальнага складу

насельніцтва трэба ўвесь час мець на ўвазе інтарэсы краю, як адзінага цэлага. Толькі ў гэтым выпадку магчыма нармальнае развіццё кожнай асобнай народнасці. Усведамленне, што ўсе мы, жыхары гэтай зямлі, з'яўляемся грамадзянамі Краю – вось нашая зыходная кропка пры высвятленні патрабаванняў розных груп насельніцтва". Поўнае задавальненне і нацыянальных і сацыяльных патрабаванняў А.Луцкевіч звязваў з устанаўленнем дэмакратычнага ладу. Пад апошнім разумелася правядзенне ў жыццё ў поўным аб'ёме "вялікіх палажэнняў, абвешчаных яшчэ Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г."

У праграмным артыкуле №1 "Кур'ера" падкрэслівалася небяспека ваяўнічага шавінізма, які "ўносіць у народныя масы ўзаемную ненавісць і ўнутраную барацьбу, пагражае распадам Краю і стратай ім магчымасці абараняцца ад людзей, якія імкнуцца знішчыць на гэтай зямлі ўсялякае пачуццё асобнасці". Між тым, "у Краі, дзе побач з літоўцам жыве паляк, побач з беларусам – яўрэй, у Краі, няшчасны лёс якога перадвызначыў ягонае адставанне і пазбавіў магчымасці свабоднага развіцця, няма месца для ўнутранай барацьбы". А.Луцкевіч заклікаў усіх "грамадзян Краю" да працы на ягоную карысць і на карысць прыгнечанага народа.

Тэрмін "грамадзянін Краю", адзін з асноўных з пункту погляду канцэпцыі палітычнай нацыі, шырока ўжываўся на старонках "Кур'ера" і "Вечерней газеты". Аўтары публікацый даводзілі, што жыццёва важныя для Краю пытанні павінны вырашацца з улікам інтарэсаў усіх этнасаў Беларусі і Літвы [7], асуджалі велікарускі і велікапольскі шавінізм [8], заяўлялі пра неабходнасць барацьбы з праявамі шавінізма сярод беларусаў і літоўцаў [9], выкрывалі сутнасць дзейнасці т.з. "Белорусского общества" як арганізацыі велікарускіх шавіністаў ў беларускай "вопратцы" [10] і інш.

А што ж "Наша Ніва"? Нават павярхоўны аналіз публікацый галоўнай беларускай газеты ўказвае на тэматычны паралелізм з матэрыяламі "Кур'ера краёвага" і "Вечерней газеты". У першую чаргу гэта прапаганда краёвай ідэалогіі ў яе дэмакратычным варыянце і барацьба з этнічным шавінізмам [11]. Падчас выбарчай кампаніі ў IV Дзяржаўную думу "Наша Ніва" падтрымала кандыдатаў, якіх адстойвала "Вечерняя газета". У адным з артыкулаў "Нашай Нівы" адзначалася: "<...> Мы, беларусы, можам верыць толькі шчырым расійскім прагрэсістам, каторые зрадніліся з нашым Краем, лічаць сябе грамадзянамі нашай старонкі" [12]. Усе выданні вялі сумесную барацьбу супраць велікапольскага і велікарускага шавінізма.

І рускамоўнае, і польскамоўнае выданне імкнуліся выклікаць сімпатыі да беларускага руху. "Вечерняя газета" асцярожна згадвала пра мясцовыя беларускія карані большасці рускай грамадскасці краю [13]. "Кур'ер краёвы" заклікаў шукаць згоду і паразуменне з беларусамі. Пры гэтым падкрэсліваліся дэмакратычныя тэндэнцыі ў беларускім руху: "Шчыры дэмакратызм беларускага руху... ягоная лаяльнасць у адносінах да суграмадзян іншых нацыянальнасцяў – гэта гарантыя, што нашыя імкненні знойдуць жывы водгук сярод беларусаў" [14].

Такім чынам, у перыяд 1911-1915 гг. сканцэнтраваны ў руках беларусаў друк у дачыненні да нацыянальнай праблемы выразна дэманстраваў сваю прыхільнасць да ідэі палітычнай нацыі. Але паўстае пытанне: наколькі шчырымі былі беларускія дзеячы ў сваёй прапагандзе ідэі палітычнай нацыі або краёвасці ў цэлым?

Аналіз крыніц, якія маюцца ў нашым распараджэнні, дазваляе казаць пра выключна прагматычнае выкарыстанне беларусамі краёвай ідэалогіі. У краёвасці яны бачылі сродак, які дазволіць узмоцніць пазіцыі беларускага этнасу ў нацыянальна-культурным і грамадска-палітычным жыцці Беларусі і Літвы. Так, напрыклад, агітацыя на старонках "Кур'ера" неабходнасці паразумення палякаў з беларусамі аргументавалася не толькі інтарэсамі сумеснай барацьбы з велікарускім шавінізмам [15]. Аўтары публікацый заявілі пра адсутнасць выразных перспектываў далейшага развіцця польскага руху ў беларуска-літоўскім краі [16]. Тут відавочны "беларускі ўхіл" краёвасці Антона Луцкевіча і іншых дзеячоў "нашаніўскага" кола. Беларуская пазіцыя далёка не заўсёды адпавядала разуменню краёвасці М.Ромэрам, найбольш паслядоўным прыхільнікам ідэі палітычнай нацыі.

Сутнасць беларускага разумення краёвасці досыць дакладна вызначылі апаненты Луцкевічаў са штотыднёвіка "Пшэглёнд Віленьскі", які ўзначальваў Л.Абрамовіч. Апошні сцвярджаў, што пазіцыя беларусаў грунтавалася на адсутнасці веры ў магчымасць захавання польскасці ў Беларуска-літоўскім краі. Да гэтага трэба дадаць перакананне кіраўнікоў беларускага руху, што беларускія і літоўскія палякі з'яўляюцца толькі нашчадкамі паланізаваных літоўцаў і беларусаў. Такая пазіцыя нараджала патрабаванні, каб польская грамадскасць працавала дзеля развіцця свядомасці беларусаў і літоўцаў. "Пшэглёнд" катэгарычна адвяргаў падобныя заявы. Ён неаднаразова абвінавачваў "Кур'ер" у "пабочных уплывах" [17]. Аднак раскрываць таямніцу беларускага польскамоўнага выдання палякі не сталі.

"Беларускі ўхіл" можна заўважыць і ў асобных артыкулах "Вечерней газеты": "Справа культуры, справа прагрэсу настолькі важная, што яе павінен падтрымліваць кожны грамадзянін Краю. Тут няма месца для меркаванняў нацыянальнага эгаізма: хто можа, той павінен садзейнічаць культурным намаганням сваіх слабейшых суседзяў, з якімі яго моцна звязаў гістарычны ход падзей" [18].

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што беларусы "нашаніўскага" кола і, у першую чаргу, А.Луцкевіч разумелі краёвасць як сужыцце розных этнасаў Краю. У гэтым сужыцці яны імкнуліся забяспечыць за ўласным этнасам лепшыя ўмовы. Дарэчы, гэта набліжала іх пазіцыю да пазіцыі групы Людвіка Абрамовіча, але гэтае ж падабенства непазбежна рабіла іх апанентамі. А.Луцкевіч спадзяваўся, што прапаганда ідэі палітычнай нацыі на польскай і рускай мовах паспрыяе далучэнню да беларускага руху як русіфікаваных і русіфікаваўшыхся, так і паланізаваных і паланізаваўшыхся беларусаў і тым самым пашырыць яго сацыяльную базу.

Міхал Ромэр характарызаваў беларускія "прэтэнзіі" як праявы этнічнага нацыяналізма [19]. Але пры гэтым галоўны ідэолаг краёвасці быў упэўнены, што А.Луцкевіч і яго сябры ўрэшце рэшт зразумеюць польскую пазіцыю і пагадзяцца з тым, што палякі Беларусі і Літвы маюць поўнае права на развіццё ўласнай культуры і на ўдзел разам з літоўцамі і беларусамі ў вызначэнні будучыні Края.

Надзея М.Ромэра была дастаткова абгрунтаванай. Відавочна, што "нашаніўскае" беларускае кола ў гэты час моцна спадзявалася на пазітыўныя вынікі супрацоўніцтва з польскімі, літоўскімі і яўрэйскімі краёўцамі-дэмакратамі. Дзеля згоды А. Луцкевіч быў гатовы пайсці на пэўныя ўступкі. Магчыма, ён разлічваў, што пазіцыя М.Ромэра будзе пашырацца сярод грамадскасці. У тым, што гэта прынясе вялікую карысць як беларускаму руху, так і ўсяму Краю, беларускі дзеяч быў упэўнены.

Але надзеі не спраўдзіліся. І на пачатку 1915 г. А.Луцкевіч на старонках "Нашай Нівы" выступіў з рэзкай крытыкай "нашых" палякаў: "Нашыя" палякі-інтэлігенты кажуць, што яны маюць поўна работы "для сваіх" – для "польскага сялянства і пралетарыяту" на нашай зямлі. Але ж польскага "дэмаса" – на смех малая жменя. А поруч з гэтай жменяй мільёны цёмных і галодных беларускіх сялян, каторыя блізка не маюць йшчэ сваёй інтэлігенцыі, для каторых німа каму працаваць... Працаваць для тых мільёнаў – гэта для нашых палякаў грэх і здрада, хоць колькі ж між імі сы-

ноў таго ж беларускага народу! <...> Яны не разумеюць, што прайшоў час панавання над намі і трэба цяпер адслужыць нашай старонцы, трэба не толькі называцца, але і быць грамадзянамі, трэба карміць галоднага і асвяшчаць цёмнага селяніна не толькі за тым, што ён – "свой", што ён пераробіцца на паляка, але затым, што гэта сьвятая павіннасць. А раз гэта павіннасць, а не ласка, дык і вучыць беларусаў трэба не так, як хоча вучыцель, а так як гаворыць народ, каторы захаваўшы сваю мову праз соткі гадоў, праявіў ясна сваё жаданне заставацца беларусам [20] ".

Гэтая крытыка не мела дачынення да М.Ромэра і прыхільнікаў ягонай краёвай пазіцыі. У наступным "нашаніўскім" артыкуле А.Луцкевіч адзначыў, што "поруч з "прыгоншчыкамі" ў нашай старонцы ёсць людзі, каторыя бароначы сваю польскую культуру, не забываюць, што яны тутэйшыя грамадзяне, што і на іх ляжыць павіннасць памагаць галодным, асвяшчаць цёмных людзей – нягледзячы, якой яны нацыі і веры.<...>

Мы верым, што сілы польскай дэмакратыі ўзрастуць, калі над зямлёй Беларусі засвеціцца зорка лепшай будучыны. А шчыры дэмакратызм створыць той залаты мост, каторы з'еднае ўрэшце народы нашага краю ў адну вялікую згодную сям'ю і каторы польскія нацыяналісты цяпер не даюць збудаваць" [21].

Зразумець самакаштоўнасць ідэі палітычнай нацыі ва ўмовах культурнага Адраджэння этнасаў Беларуска-літоўскага краю, ва ўмовах абвастрэння міжэтнічных адносін было вельмі няпроста. Даволі прагматычнае стаўленне беларусаў да гэтай ідэі на пачатку XX ст. не павінна здзіўляць. Аналагічна гэтую ідэю трактавала большасць польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх дзеячоў.

Адным з апошніх актаў супрацоўніцтва краёўцаў было ўтварэнне напрыканцы 1915 г. ва ўмовах Вільні, акупаванай Германіяй, Часовай Рады Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага. Фактычна Рада выступала за дзяржаўную незалежнасць "гістарычнай Літвы". Новаўтвораная дзяржава павінна была гарантаваць усім яе этнасам права на свабоднае культурнае развіццё. Гэтая арганізацыя аб'яднала дзеячоў розных этнічных рухаў, а ініцыятыва яе стварэння належала беларусам. Аднак выпрабавання часам яна не вытрымала. Абвастрэнне міжэтнічных адносін (асабліва польска-літоўскіх), да чаго сваю руку прыклалі і прадстаўнікі германскай акупацыйнай адміністрацыі, хутка разбурылі гэтую трохі рамантычную ідэю. Негатыўную ролю адыграла таксама радыкалізацыя беларускага руху, якая хутка адбывалася пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі. Адрадзіўшаяся ў 1917 г. Беларуская Сацыялістычная Грамада ўспрымала беларускі этнас як сялянска-рабочы. Прадстаўнікам іншых сацыяльных колаў (асабліва землеўладальнікам) было амаль немагчыма заваяваць давер сацыялістаў.

Аднак віленскія беларускія дзеячы, магчыма, па прычыне слабасці беларускага руху вельмі доўга захоўвалі вернасць краёвай ідэалогіі. Так, ідэя дзяржаўнасці гістарычнай Літвы яшчэ ў 1917 г. дамінавала ў беларускім руху на захад ад лініі фронта. Толькі на пачатку 1918 г. беларусы былі вымушаныя канчаткова ад яе адмовіцца. Сваю ролю адыграла прызнанне Германіяй незалежнасці "этнаграфічнай" Літвы са сталіцай у Вільні і імперскія амбіцыі палітыкаў новай Польшчы, якая хутка ўмацоўвала свой дзяржаўны суверэнітэт і разглядала беларускія землі як сферу свайго палітычнага дамінавання.

Такім чынам, на пачатку XX ст. у сілу неспрыяльных унутраных і знешніх абставін ідэя палітычнай нацыі не стала падмуркам беларускага руху, хаця вельмі актыўна выкарыстоўвалася беларусамі. Між тым гісторыя Еўропы ўсяго XX ст. выразна засведчыла перспектыўнасць менавіта дактрыны палітычнага нацыяналізма. Галоўным крытэрыям нацыянальнай прыналежнасці паступова сталася ўжо не этнічнасць, а грамадзянства. Падобны падыход дазволіў ва многіх краінах звесці да мінімуму этнічныя канфлікты, паспрыяў фармаванню грамадзянскай супольнасці.

Аднак гэты вопыт не быў выкарыстаны беларускімі адраджэнцамі 90-ых г. XX ст. Кіраўніцтва Беларускага Народнага Фронту актыўна выкарыстоўвала ідэалогію этнічнага, а не палітычнага нацыяналізма, што прыкметна абмежавала магчымасці беларускага руху. Напрыканцы нашага стагоддзя прапаганда этнічнага нацыяналізма непазбежна робіць ягоных прыхільнікаў грамадскімі маргіналамі. У той жа час ідэалогія палітычнага нацыяналізма, асабліва ва ўмовах, калі насуперак намаганням уладаў у Беларусі працягваецца працэс фармавання беларускай палітычнай нацыі, калі этнічная свядомасць саміх беларусаў абсалютна пазбаўлена этнацэнтрызма, дае пэўны шанс завяршыць працэс беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння ўтварэннем незалежнай дэмакратычнай беларускай дзяржавы.

ЗАЎВАГІ

1. Гл. падрабязней у арт.: Смалянчук А. "Краёвасць" у беларускай і літоўскай гісторыі. // Беларускі гістарычны агляд, том 4, сшытак 1-2 (6-7), снежань, 1998, Менск.
2. Ромэр М. Дзеннік. Т.4, с.403. Запіс ад 3(16) сакавіка 1915 г. // Аддзел рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы.
3. Гл. падрабязней у арт.: Смалянчук А. З гісторыі віленскага масонства пачатку XX ст. // Спадчына, 1998, №5.
4. Ромэр М. Дзённік. Т.2., с.435. Запіс ад 24.10.(6.11).1912 г.
5. Ромэр М. Дзённік. Т.2, с.450. Запіс ад 8(21)11.1912 г.
6 Ромэр М. Дзённік. Т.3, с.61. Запіс ад 27.02.(12.03).1913 г.
7. Напр.: Генрык Букавецкі [А.Луцкевіч]. Прынцыповае пытанне. // Кур'ер краёвы, 1912, №19; б/п. [А.Луцкевіч?]. Одна из причин трений. // Вечерняя газета, 1913, №337 і інш.
8. Напр.: б/п. [А.Луцкевіч?]. Конквистадоры. // Вечерняя..., 1913, №360; м.г. [М.Ромэр]. Хто быў правы? // Кур'ер..., 1913, №127 і інш.
9. Напр.: б/п. [А.Луцкевіч?]. Национальные течения и демократия. // Вечерняя..., 1914, №468 (гл.дадатак 1) і інш.
10. Напр.: Вечерняя..., 1913, №188.
11. а-н-а [А. Луцкевіч]. Край і народ. // Наша Ніва, 1912, №28-29 (гл.дадатак 2); а-н-а [А.Луцкевіч]. Змаганне з хваробай. // Наша Ніва, 1913, №9 і інш.
12. Наша Ніва, 1912, №40.
13. Напр.: б/п. [А.Луцкевіч?]. Национальная культура. // Вечерняя..., 1912, №92.
14. Генрык Букавецкі [А.Луцкевіч]. Час патрабуе. // Кур'ер..., 1913, №12.
15. Генрык Букавецкі [А.Луцкевіч]. Прынцыповае пытанне. // Кур'ер..., 1912, №9.
16. К-вец [А.Луцкевіч]. Do ut des. // Кур'ер...,1913, №98.
17. б/п. [Л. Абрамовіч?]. Пабочныя ўплывы. // Пшэглёнд..., 1913, №22/23.
18. м.р. [М. Ромэр]. Грамадзянская пазіцыя. // Кур'ер..., 1913, №77.
19 Ромэр М. Дзённік. Т.3, с.324. Запіс ад 17(30).11.1913 г.
20. а-н-а. [А. Луцкевіч]. Кліч да згоды. // Наша Ніва, 1915, №10.
21. а-н-а. [А. Луцкевіч]. Іх адказ. // Наша Ніва, 1915, №2-13.

КРУГЛЫЙ СТОЛ ПОЛИТОЛОГОВ НА ТЕМУ: ДЕМОКРАТИЯ И НАЦИОНАЛИЗМ КАК АЛЬФА И ОМЕГА ПОЛИТИЧЕСКОГО ПРОЦЕССА

Плиско М.К.: В политологии существуют разные подходы к понятиям "демократия" и "национализм". Одни считают, что они взаимно исключают друг друга и никоим образом не сочетаются, а выражение "демократический национализм" в лучшем случае звучит как "жареный лёд" или "круглый квадрат". Другие полагают, что национализм играет в истории прогрессивную роль, особенно в тех странах, которые запоздали с проведением буржуазных революций и в которых их осуществление совпало с образованием национальных государств. Для таких стран – Германия, Италия – национализм выступил в роли своеобразного демиурга, творца единых централизованных государств. Национальная идея помогла, например, добиться свободы от турецкого владычества грекам, болгарам, румынам, сербам. И если во вновь образовавшихся государствах не всегда всё ладно было с демократией, то ведь в условиях колониального господства и национально-освободительной борьбы о ней вообще нельзя было вести и речи, т.е. демократическим может стать и быть только национально не зависимое государство. Конечно, жизнь богаче любой схемы: как говорят, теория суха, а древо жизни зеленеет. Развитие каждой страны свершается не по каким-то раз и навсегда изготовленным лекалам, а имеет свою неповторимую специфику. Думаю, что и наш народ в своей истории не раз сталкивался с необходимостью решать проблему оптимальной сочетаемости понятий "национализм" и "демократия". Последний раз это было в конце 80-х годов. Если бы мы все тогда осознали важность этой проблемы и верно определили место национальной компоненты в общедемократическом движении, то наверняка не было бы и 1994 года, когда на президентских выборах победа досталась выразителю интересов советских белорусов. Не решена, на мой взгляд, эта проблема и по сегодняшний день. Не хотелось, чтобы, обсуждая эту тему, мы ограничились пересказом каких-то общетеоретических положений. Давайте не забывать о белорусских реалиях. Они дают богатую пищу для размышлений по этой проблеме.

Злотников Л.К.: В поведении каждого человека есть и биологическая, и социальная составляющая. Но не только у отдельного человека. Это присуще и коллективу людей, и человеческому сообществу в целом. В их действиях можно проследить инстинкты, присущие стадному поведению. Без учета биологического и социального факторов невозможно, по-моему, компетентно вести разговор по проблеме, которую мы собрались обсуждать. Поэтому заранее прошу меня простить за несколько предварительных замечаний. Без них будет непонятна моя позиция, которую я здесь собираюсь отстаивать.

Под социальным фактором в поведении человека я понимаю то, что в нём появилось (по Хайеку) в процессе становления расширенного порядка и определялось нормами развивающейся морали. Это можно считать в человеке чисто человеческим, так как оно не задаётся и не определяется инстинктами. Среди инстинктов человека одним из сильных является коллективистский инстинкт, т.е. стремление быть в группе, находиться под защитой себе подобных. (Именно он лежит в основе теоретических построений социалистических учений.) Коллективистский инстинкт на подсознательном уровне автоматически заставляет человека делить людей на "своих" и "чужих". И язык в этом процессе играет важную роль. Приведу один пример, который мне рассказал Михаил Залесский. Как-то он был в семье, жившей в глухой деревушке Витебской области. Разговор шёл на белорусском языке, но язык Залесского соответствовал литературным канонам, а язык хозяев – нормам, принятым в данной местности. Когда взрослые наговорились, к отцу подошёл молчавший до сей поры семилетний мальчик и сказал, показывая на Залесского, что этот дядька чужой. На вопрос, почему чужой, мальчик ответил, что у него "не тая мова". То есть в данном случае индикатором деления на своих и чужих у мальчика стало несовпадение двух диалектов языка. И деление он произвёл автоматически, на подсознательном уровне. Это и есть инстинктивное проявление биологического начала у человека.

Выражением биологического начала и проявлением природного инстинкта стадности у животного и человека является также стремление защитить территорию своего обитания или проживания. Человек, живя в коллективе среди себе подобных, инстинктивно надеется, что это обеспечит ему безопасность. Таким образом, у каждого человека существует биологическая потребность жить в "своей" группе, в коллективе, и это нормальная потребность, она объективно существует и от неё мы никуда не уйдём.

Выражением социального в обществе является мораль. Её предназначение – регулирование поведения человека в коллективе и обществе. Надо сказать, что нормы морали, как и чисто биологические инстинкты, оказывают значительное влияние на поведение человека. Приведу один пример, который показывает механизм регулирования социальной жизни первобытного общества. В африканском племени зулусов существовал обычай, запрещающий садиться кому-либо на скамью, на которой сидел вождь племени. По поверьям, того, кто осмелился бы это сделать, ждала в течение суток смерть. И когда однажды один воин сел на эту лавку, а потом узнал о запрете, то он действительно через день умер. Это показывает силу социальных регуляторов поведения людей в обществе, особенно если люди в них верят.

Биологическая потребность быть в группе, коллективе может проявляться самыми различными способами. Это могут быть семья, клан, этнос, религиозная группа, подданные короля, советский народ, класс, государство, человечество и т.д.

Нация – недавно возникшая общность людей – есть продукт развития капитализма, т.е. социальное, а не биологическое образование. Часто её территория формируется случайно. Возьмём, например, Баварию. По мнению политологов, она как этническое образование могла оказаться как в составе Германии, так и в составе Австрии. Так формировались нации в Европе (об этом можно прочитать, например, в Encyclopedia Americana (ст. "nationalism")), и сходство или несходство языков различных этносов не имело при этом никакого значения. Например, араб из Алжира, давно живущий во Франции, может считать себя французом. Во Франции нацию определяют по человеческим критериям – по принципу гражданства, а не биологическим, т.е. по этническому происхождению. Так же и в США. Если кто-либо получил американское гражданство, то независимо от цвета кожи, расового происхождения и языка он становится частичкой американской нации. В странах, в которых преобладает такой подход к определению гражданства, в определении понятия "нация" превалирует социальный, а не биологический подход.

Хадыка Ю.В.: Чалавек вельмі складаная істота, яшчэ больш складаная рэч – чалавечая супольнасць, і апісваць працэсы, якія ў ёй адбываюцца, можна рознымі спосабамі. Мне, напрыклад, больш падабаецца фізіка-матэматычны. Чалавечую супольнасць можна разглядаць як шматчастковую сістэму, якая падпарадкоўваецца ў сваім развіцці законам статыкі, дынамікі і г.д. Вядома таксама, што ў любой сістэме, пакінутай самой сабе, расце энтрапія, павялічваецца хаос. Прыкладна тое ж самае адбываецца і з грамадствам. Калі ў грамадстве ўтвараецца нейкая нацыянальная супольнасць, гэта азначае, што адбыўся вялікі культурны акт. Гэта ёсць творчы акт, гэта праяўленне патрэбы супрацьдзеяння энтрапіі і хаосу. Без гэтага цывілізаванае грамадства даўно перестала б існаваць. Таму ва ўсім свеце дзеянні, якія накіраваны на знішчэнне культураў вялікіх і малых народаў, лічацца злачыннымі. Такая палітыка завецца генацыдам – злачынствам супраць чалавецтва. Адсюль выснова: супрацідзейнічаць развіццю культуры любога народа, у тым ліку і беларускага, а тым больш знішчаць яе, ёсць нішто іншае, як злачынства. Аб гэтым вельмі выразна пісаў Зянон Пазьняк, хаця месцамі ў дастаткова рэзкай форме. Трэба зазначыць, што ён меў вялікіх папярэднікаў. Я спашлюся пры гэтым не на Хаека, як гэта рабіў сп. Леанід, а на такі аўтарытэт, як Фрыдрых Гегель. Ён лічыў, што толькі той народ, які мае высокую ступень самасвядомасці, якая ўвасабляецца ў нацыянальным або народным духу, з'яўляецца суб'ектам гісторыі. На маю думку, такім суб'ектам былі беларусы, бо беларуская нацыя існавала з часоў утварэння беларускай дзяржавы. На жаль, здарылася так, што пазней іншыя этнасы падпарадкавалі сабе беларусаў, і на нашай зямлі пачаліся працэсы дэнацыяналізацыі, якія мелі злачынны характар. Таму, калі весці гаворку пра суадносіны паняццяў "нацыяналізм" і "дэмакратыя" адносна беларускай глебы, я ўпэўнены, што іх ніўякім разе нельга супрацьстаўляць. Зразумела, што па свайму зместу гэтыя паняцці і не павінны супадаць. Нацыяналізм бывае і агульнадэмакратычны, ён можа мець сацыял-дэмакратычную афарбоўку, як гэта было ў нас на пачатку XX стагоддзя, а можа быць і ў форме фашызму і камунізму, але на Беларусі нацыяналізм меў толькі дэмакратычны характар, больш за тое – менавіта нацыянальныя дэмакраты рухалі на Беларусі дэмакратычны працэс наперад. Сп. Міхась слушна казаў, што для некаторых народаў нацыяналізм выступаў у ролі дэміурга ў справе стварэння нацыянальнай дзяржавы. Гэта сапраўды так. Гегель яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя звязваў паняцце "нацыянальнай самасвядомасці" з уваходам народа ў сусветную гісторыю ў якасці самастойнага суб'екта. Гэта было сказана задоўга да таго, як узніклі нашы праблемы. На маю думку, нацыяналізм – гэта вельмі прыгожая ідэя, якая мае бездакорную палітычную практыку. Большасць дэмакратычных краінаў свету ў дадзены момант з'яўляюцца краінамі ўтоленага нацыяналізму. Але і перад імі час ад часу ўзнікае праблема абароны сваей нацыянальнай культуры і мовы. Я маю на ўвазе Францыю, якая прыняла адмысловы закон, скіраваны на абарону сваёй мовы ад англанізмаў. Беларусь жа, як і некаторыя іншыя дзяржавы, адносіцца да краінаў з неўтоленым нацыянальным пачуццём. У існаванні нацыяналізму няма нічога дзіўнага, бо ён з'яўляецца натуральным праяўленнем этнічнай і культурнай самаідэнтыфікацыі любога народа. Этнас мацуецца шматлікімі сацыяльнымі фактарамі, якія існуюць сярод людзей, у тым ліку і рэлігійным, але на Беларусі гэты фактар не дзейнічае. Паколькі Беларусь знаходзіцца не на востраве, як Ісландыя, а на перакрыжаванні гісторыка-культурных шляхоў, аслаблены ў нас і этнічны фактар самаідэнтыфікацыі. Але ў нас захавалася свая асабістая культура, якая і павінна стаць сродкам самаідэнтыфікацыі беларускага народа, і ў першую чаргу мова, якая з'яўляецца формай існавання гэтай культуры. Менавіта таму з пачатку сваей дзейнасці БНФ і выступіў з патрабаваннем абароны і адраджэння беларускай мовы, бо яна з'яўляецца відавочным інтэгруючым фактарам умацавання нашай нацыянальнай супольнасці. Людзі гэта цудоўна разумеюць, у тым ліку і тыя, хто ў дадзены момант не размаўляе па-беларуску. Нездарма на апошнім перапісу насельніцтва шмат было такіх, хто заявіў, што дома карыстаецца беларускай мовай, хаця насамрэч гэта было не так. Такіх было больш за 40%. Гэта моцнае перабольшванне, гэта своеасаблівы фенамен, якога ніхто не чакаў. Але людзі адказвалі менавіта так, бо лічылі выкарыстанне ў побыце беларускай мовы неабходным фактарам сваёй беларускасці. Гэта значыць, што яны разглядалі мову не ў якасці звычайнага носьбіта інфармацыі, а ў якасці культурнай з'явы. Падкрэслю яшчэ раз: на Беларусі нацыяналізм заўжды спрыяў развіццю дэмакратыі і быў носьбітам дэмакратычных каштоўнасцяў. У нас нацыяналізм ніколі не выкарыстоўваўся супраць дэмакратаў і дэмакратыі. Так было і ў 1917-1918, і ў 1941-1945, і ў 1989-1991 гг. Асабіста я лічу, што без станоўчага вырашэння нацыянальнага пытання нельга будзе пабудаваць дэмакратычнае грамадства.

Плиско М.К.: Страны, расположенные в континентальной части Европы, кроме Нидерландов, вынуждены были догонять ушедшие вперёд по пути буржуазного развития Британию и США. Догоняющая модель развития была присуща и Германии, и Австрии, и Италии, не говоря уже о России. Это наложило свой отпечаток и на решение той проблемы, которую мы обсуждаем, – соотношение понятий "национализм" и "демократия". В Британии установление демократии предшествовало решению проблемы национальной самоидентификации. Поэтому национальная компонента в развитии этой страны играла гораздо меньшую роль, нежели в истории других европейских стран. Не будет, видимо, преувеличением сказать, что на британских островах не необходимость воплощения народного духа в государстве (по Гегелю), а демократия привела, если так можно сказать, к рождению британского национального государства, а позднее и империи. Определённый космополитизм, присущий этой стране, стремление навязать другим народам своё миропонимание, в том числе и с помощью вооружённой силы, способствовали появлению традиции, выражавшейся в осуждении национально-освободительных движений и национализма. В англосаксонской научной литературе она дожила и до сегодняшнего дня. Совсем иное место занимала национальная идея в политике и культуре стран Центральной и Восточной Европы. То, о чём мечтал Гегель, воплотилось в Германии только во второй половине XIX столетия. Процесс воплощения народного духа в государстве происходит не в безвоздушном пространстве, а на определённой территории. То есть он неизбежно сталкивается с интересами других народов, которые по уровню развития своего национального самосознания могут быть и не готовыми к созданию своего собственного национального государства. Процесс становления национальных государств сталкивается, таким образом, с проблемой поиска некоего критерия "справедливого" деления территорий, особенно в том случае, если на ней проживает смешанное население. К сожалению, чаще всего в роли подобного критерия выступает сила, в том числе и военная. Это негативно сказывается на укреплении и развитии демократических институтов, так как приводит к возникновению межнациональных конфликтов как внутри отдельных государств, так и между государствами, что в свою очередь может привести к дискредитации национальной идеи и национализма. То есть национализм в отличие от демократии носит амбивалентный характер. Если речь идет о национализме, который ущемляет законные интересы других национальных культур, то он не может носить

НАЦИОНАЛИЗМ И ПРАКТИКА ПОЛИТИЧЕСКОГО ПРОЦЕССА

прогрессивного характера. Такая политика плохо сочетается с демократическими принципами, и её можно охарактеризовать как имперскую и великодержавную. Часто бывает так, что народ, который сам с большим трудом добился независимости, начинает угнетать национальное меньшинство, проживающее на территории его государства. Вспомните, например, политику болгарского руководства по отношению к турецкому меньшинству или политику Чаушеску к венгерскому меньшинству. Леонид Константинович говорил о биологическом начале в человеке, о его инстинктивном стремлении жить в коллективе людей, подобных себе. Это, мол, приводит к делению людей на своих и чужих. Возможно, что в политике подавления национальных меньшинств это биологическое начало в человеке находит свое проявление, только на ином, качественно другом уровне. Видимо, в достижении некой национальной гомогенности в пределах своего государства правящая элита видит один из способов обеспечения национальной безопасности для своего собственного народа. Это лишний раз говорит о том, что проблема взаимодействия демократии и национализма гораздо сложнее, чем это может показаться на первый взгляд. Если говорить о нашем опыте сочетания национальной компоненты с общедемократическими ценностями, то, на мой взгляд, он был не совсем удачным. Причина, видимо, заключается в том, что значительная часть нашего народа была не готова к восприятию не только национальных, но и демократических ценностей. Этих людей условно можно одновременно назвать и советскими белорусами, и тутэйшыми. Формирование их мировоззрения проходило в послевоенное время на фоне усиления политики подавления белорусской культуры и языка. Из-за чисток и репрессий в предвоенные годы и больших людских потерь во время войны произошло ослабление этнического ядра белорусского народа. В результате этого процесс денационализации в Беларуси зашёл дальше, чем в любой другой республике бывшего СССР. Именно поэтому в конце 80-х гг. национальная идея, идея построения собственного государства не смогла стать знаменем всего демократического движения. По этой причине повторить путь, которым шли к построению независимого демократического государства Латвия, Литва и Эстония, мы не могли, как бы этого ни хотелось некоторым лидерам БНФ. Если я правильно понял сп. Хадыку, то он сказал, что БНФ ухватился за язык именно потому, что по этому признаку было легче всего объединить тех, кто считал себя белорусом и выступал за образование самостоятельного независимого государства. Мне кажется, что подобная политика БНФ была не совсем верной. На самом деле потенциальная база демократического движения была значительно шире. Об этом, кстати, косвенно свидетельствуют данные переписи населения конца 90-х гг., о которых говорил сп. Хадыка. Использование языкового фактора в качестве деления на своих и чужих оттолкнуло от БНФ многих демократически настроенных людей, если хотите – попутчиков, и значительно сузило базу демократического движения в целом. В начале 90-х гг. мне лично не раз приходилось сталкиваться с легкомысленными утверждениями некоторых чересчур "свядомых" бэнээфовцев, которые всех, кто не разговаривал на белорусском языке, называли предателями и коллаборационистами. Организация, которая претендовала на роль лидера политической оппозиции, должна была просчитать негативные последствия такой политики. Презрительное и подозрительное отношение к русскоязычным белорусам со стороны радикальной части БНФ умело использовала в своих интересах тогдашняя власть и выразители интересов советских белорусов. В результате и без того слабое демократическое движение оказалось расколотым и на президентские выборы оно вышло двумя колоннами, выдвинув в качестве кандидатов в президенты Пазьняка и Шушкевича. Итог этих выборов известен. Победа досталась выразителю интересов советских белорусов – Александру Лукашенко. Демократическое движение потерпело поражение из-за того, что его лидеры не смогли найти верного соотношения между национальной и демократической компонентой в борьбе за политическую власть в стране. Дай бог, чтобы и на предстоящих президентских выборах мы не воспроизвели ситуацию 1994 года.

Важным фактором является также большое число так называемых независимых кандидатов. В России и Украине партии слабо контролируют процесс выдвижения кандидатов. Например, в России число независимых голосующих без партийной идентификации составляет 78%, в то время как в США – 13%, а в Великобритании – лишь 8% [7]. В Украине в 1994 году независимых кандидатов официально был 61%, в России в 1993 году – 48%, в 1995 г. – 35%. Среди выигравших выборы в независимых округах было: в России – 52% в 1993 году, 34% – в 1995 г., а в Украине – 40% в 1994 г. В то время как в Литве только 3% выигравших выборы были независимыми, в Венгрии – 7% в 1990 г. и 2% в 1994 г. Так что в Польше, Венгрии и Литве партии всё больше монополизируют процесс выдвижения кандидатов, приближаясь к западным образцам [3].

Тут, правда, надо отметить факт, выпавший из поля зрения западных политологов. Наши независимые – это самые настоящие зависимые кандидаты, представители союза властной биорократической номенклатуры и олигархических кланов. По всем параметрам их смело можно назвать представителями партии власти, которая у нас вполне институционализована и не имеет лишь правовой легитимации. В Украине, как и России, устойчивыми партиями заняты только края спектра, а между ними – широкий и аморфный центр. Потому и высок – около 40% – процент людей, не определившихся в своих партийных пристрастиях. В этом аморфном центре и "плавают" наши "независимые".

Таким образом, отсутствие чёткой ориентации электората на малое число больших и известных партий не позволяет сработать эффекту снижения числа партий Duverger-а. В условиях дезориентированного по отношению к партиям избирателя в игру вступают местные авторитеты, так называемые нотабли, проще говоря,"денежные мешки". Поиск выходов из такого положения весьма непрост.

Интересные результаты представлены в работах группы Голосова Г.В. из Санкт-Петербурга. Они утверждают, в частности, что в тех ПК странах, где компартии и их элиты быстро отошли от власти, – скажем, в ГДР, Чехословакии – быстро была внедрена ПС. Там же, где они сохранили свои властные рычаги (Украина, Беларусь и многие другие ПК страны), наоборот, внедрялась преимущественно МС система [8]. Смешанные же несвязанные ИС, в том числе и в Украине, появились как результат компромиссов старых и новых элит. Они введены также в России, в Болгарии и Венгрии.

Роль старых коммунистических элит, наследия номенклатурной власти, в данном вопросе крайне важна. Особенно в таких странах, как Россия и Украина, где новые элиты ещё слабы, не организованы, а главное, практически полностью зависимы – и экономически, и политически – от властей.

Однако, как показано в исследовании Голосова Г.В. и Шевченко Ю.Д., важными являются также структурные факторы состояния общества [9]. В их статье исследуется связь уровня плотности (то есть внутренних коммуникативных связей) социальных сетей населения и успехов независимых кандидатов. Показывается, что там, где социальные сети более плотные (а это сёла, малые города и т.п.), большего успеха добиваются независимые кандидаты и наоборот.

Структурные факторы, в частности, уровень урбанизации сильно влияют на электоральную политику. Как говорил Huntington, политические партии возникают и развиваются в городских условиях [4]. Лидерами партий становятся образованные, современно мыслящие люди, а партийная принадлежность кандидатов сильно зависит от того, где они выдвигаются – в городе или на селе. Предлагаемые нами в следующем разделе новации основаны на подобных соображениях.

Некоторые оценки и предложения

Число партий у нас велико – это действительно плохо. Но надо ли так отчаиваться по этому поводу, как делает это большинство авторов, в том числе и Moser? Задумаемся, было ли бы хорошо для страны, если бы МС, в соответствие с законом Duverger-а, отсеивала бы все мелкие партии и оставляла только крупные? Какие крупные партии она оставила бы на этой стадии? КПУ, КПРФ и очередные партии власти этих стран?

Да, число партий надо сокращать. Но не любой ценой, ибо с водой можно выплеснуть ребёнка, нужного и перспективного ребёнка. Поэтому нам надо выбирать такие ИС, чтобы они не просто сокращали число партий, а сокращали разумно, давая им при этом заслуженные оценки. Чтобы оставались и укреплялись перспективные партии, а уходили в небытие неадекватные стоящим перед страной задачам.

Мы согласны с Moser-ом, что прямое применение закона Duverger-а в странах с недостаточно институционализированной партийной системой не приводит в чистом виде к результатам, ожидаемым для консолидированных демократий. Однако мы не согласны с той категоричностью, с которой он это заявляет, значительно упрощая при этом картину. Мы считаем, что, хотя у нас и нет партийной системы в её западном толковании, у нас уже есть нечто, что является её прообразом. У нас, во-первых, есть не легализованная, но абсолютно институционализованная партия власти. Кроме того, у нас есть достаточно институционализованная парадигма следующей дихотомии общественного сознания: вперёд, к реформам, или назад, к советскому прошлому. Первая идеологема сводится к призывам поддержать на вторых турах президентских выборов кандидата от партии власти (как это было в России в 1996 году и в Украине в 1999 году), противостоящего носителю второй идеологемы от коммунистической партии.

Можно высказать гипотезу, что свойство мажоритарной ИС укреплять двухпартийную систему, сокращая число партий, может начать играть свою позитивную роль лишь тогда, когда первая идеологема станет более чётко и однозначно ассоциироваться избирателем с одной какой-нибудь партией или блоком. А поскольку этого нет, избиратель путается и мечется между многообразием партийных названий и программных заявлений, пытаясь найти ассоциативные связи своих электоральных надежд с названиями партий. В результате такой путаницы, думается, эффект Duverger-а и не даёт результатов. Чем и пользуются так называемые независимые кандидаты.

Кроме того, как только, хотя бы частично, будут заполнены идеологически пустые интервалы спектра, преимущественно в лево- и правоцентристских его частях, сразу в сознании избирателя появятся значительно более чёткие картины партийной системы в стране, и он начнёт проявлять несвойственные ему сегодня обучаемость и стратегичность голосования.

Для этого и сам парламент должен активизировать, возбуждать и инициировать деятельность партий, в том числе и непарламентских, электоральных партий. Необходимо, чтобы он, создавая реальную, а не мифическую необходимость действий по ответственному управлению страной, стал ускорителем, возбудителем политического процесса, чтобы он, понимая силу своей роли в обществе, давал постоянные социальные заказы партиям, выжимая из них все "соки". Партиям в этой ситуации ничего другого не останется делать, как впитывать в себя "соки" из общества. И тогда это расшевелит общество, заставит его находить в себе и рекрутировать из себя в политику всё новые и новые кадры, способные дать свою духовную и интеллектуальную силу стране.

Так какой же должна быть ИС, чтобы способствовать этим условиям? Думается, что в наших условиях крайнего социального расслоения общества избирательное право, оставаясь всеобщим и равным, должно стать, так сказать, разнонаправленным, неодинаково распределённым среди разных социальных групп населения. Разные социальные группы должны на первых порах становления демократии, в силу неоднородности общества, иметь разную степень влияния на ветви формирования законодательных органов.

Общество переходного типа, в отличие от общества с установившейся демократией, представляет себой негомогенную среду, расслоенную на две части:

Первая часть, настроенная на прогресс и реформы. Это люди в основном городские, молодые и образованные.

Вторая часть, настроенная на консерватизм, на ностальгию и страх перед социальными последствиями реформ. Это, соответственно, люди сельские, немолодые и малообразованные.

Мы, в отличие от Moser-а и других авторов, считаем, что укрепление новых малых партий, производимое ПС-ветвью для ПК стран, и актуально и полезно. Важно лишь, чтобы укреплялись действительно достойные малые партии. Следовательно, надо распределить влияние электората на формирование парламента в смешанной ИС так, чтобы большее влияние на её ПС-ветвь имели те социальные группы населения, которые настроены более прогрессивно, и, в силу этой своей прогрессивности, лучше информированы и разбираются в современных тенденциях развития партийной системы страны. Ясно, что это представители первой выделенной социальной группы.

Вторая же группа, очевидно, скорее ориентирована на личные качества кандидатов. И в условиях, когда у нас в мажоритарных округах ещё не так велико влияние партий, когда личные качества играют первостепенную роль, их умение (а это, напомним, люди пожилые, сельские, пусть и малообразованные, но знающие жизнь и людей "не по учебникам") разбираться в людях, их моральных качествах больше подойдёт именно для мажоритарной ветви.

В городе, даже если голосуют за персоналии, всё равно в конечном итоге голосуют за партии, которых эти персоналии представляют или с которыми ассоциируются. В селе же, наоборот, голосуют за те партии, с которыми соотносят кто-то из известных им людей. Это различие станет ещё более выпуклым, если принять закон (как в Германии), что кандидат в мажоритарной ветви может выдвигаться только в той области (а то и в районе, городе), где сам проживает. Тогда их всех люди будут знать и правильно в них разберутся.

В новый парламент должны попасть партии растущие, перспективные, те партии, которые, попав туда, смогут вызвать отмеченную выше волну обратной связи с народом, волну социального заказа от органов власти к обществу, к простым людям. Город менее подвержен влиянию популизма, неважно откуда приходящего: с левого или правого края спектра. Село же этому подвержено, оно верит мифам и красивым конструкциям как вчерашнего, так и завтрашнего дня. Сельской бабушке, даже если она целый день смотрит телевизор, очень сложно отличить партию "Реформы и Порядок" от Народно-демократической партии или один Рух от другого. И не потому, что селяне не так умны, – вовсе нет. Дело в том, что село менее политизировано, там нет той атмосферы, того эфира, в котором носятся идеи и информация, более-менее адекватная реалиям политической кухни, нет политизированного общественного климата. Но зато там есть значительно более плотные социальные сети и внутренняя коммуникативность, благодаря чему им гораздо легче выбрать из своей среды нужных людей, отражающих их жизненные запросы, а также региональные, местные интересы.

Технически это можно реализовать так. Для каждого избирателя, имеющего, согласно смешанной системе, 2 голоса, производится пересчёт голосов и устанавливается дифференцированная степень влияния на каждую из ветвей ИС. Выделяются три признака: город-село; образованные-малообразованные; молодые-немолодые, которым присваиваются веса, скажем, по 0.2. Тем, кто попадает в первую группу по какому-либо признаку, голос по ПС-ветви увеличивается на 0.2, а по МС-ветви – уменьшается на столько же. И, соответственно, наоборот. Значения пересчитанных голосов будут в интервале от 0.4 до 1.6. При этом сумма этих новых дробных голосов избирателей по обеим ветвям по-прежнему будет равна 2, чем не будет нарушаться принцип равного избирательного права.

Скажем, молодой образованный горожанин будет иметь по МС-ветви: 1-0.2-0.2-0.2=0.4 голоса; а по ПС-ветви: 1+0.2+0.2+0.2=1.6 голоса. И наоборот, немолодой малообразованный селянин по МС-ветви будет иметь 1.6, а по ПС-ветви – 0.4 голоса. Молодой образованный селянин по МС-ветви получит: 1-0.2-0.2+0.2=0.8 голоса, а по ПС-ветви: 1+ 0.2+0.2-0.2=1.2. Немолодой малообразованный горожанин по МС-ветви: 1+0.2+0.2-0.2=1.2, по ПС-ветви: 1-0.2-0.2+0.2=0.8. Можно брать коэффициент равным не 0.2, а, скажем, помягче – 0.1, или, наоборот, порезче.

Ясно, что это скажется на нарезке округов, ибо меняется их представительность. Размеры (число избирателей) сельских мажоритарных округов окажутся меньше городских, а их число, соответственно, больше. Но это будет нормально, ибо будет отражать объективное состояние общества. Потому что общество сегодня таково, что для него полезнее, когда вторая группа населения, которая, очевидно, больше сконцентрирована на селе, лучше подготовлена для принятия стратегических электоральных решений по МС-ветви. И, соответственно, первая группа больше концентрируется в крупных городах, а их уровень более подходит для принятия стратегических решений по ПС-ветви.

И ещё один нюанс. В силу третьей части закона Duverger-а получится так, что вторая группа будет больше влиять на укрепление крупных партий. На Западе Украины это, по-видимому, ещё долгое время будет некая партия национально-демократического, правого направления. На Востоке страны, соответственно, настроенная пророссийски партия левого толка. И это тоже нормально, ибо адекватно ситуации. Поскольку общество в Украине фактически именно таково, то стоит, видимо, стремиться наряду с достижением стратегической цели выравнивания, нивелирования такого разде-

ления страны в короткой перспективе стараться, чтобы это досадное разделение наилучшим, по возможности, способом трансформировалось в электоральные решения народа, вынесло бы на гребень политической волны те партии, которые наиболее осмысленным и адекватным образом были оценены на выборах наиболее подготовленными для этого группами населения. В парламенте должны быть эффективно представлены, во имя избежания возможных конфликтов и расколов в обществе, все реально существующие общественные настроения в нём.

Введенными дробями мы фактически лишь усиливаем, подчёркиваем то, что реально и так существует в обществе, но что при существующей ИС, не учитывающей расслоения общества, проявляет себя смазанно, слепо и, благодаря этой смазанности, не структурирует должным образом политические силы как в парламенте, так и вне его. А в предлагаемом варианте в парламенте будут присутствовать как партии, адекватно и позитивно воспринимаемые политически продвинутой городской средой, так и скоррелированные с насущными потребностями и ожиданиями регионов персоналии. Данную концепцию, безусловно, можно рассматривать и в контексте двухпалатного парламента.

Так может быть преодолён и тот колоссальный разрыв, который существует сегодня между политическими институтами и большинством населения, разрыв, имеющий своим результатом неприязнь и раздражённость простых людей от одних только слов "Верховная Рада", "партия" и т.п. Подобное отношение людей имеет под собой почву – это не их институты, по большому счёту, они не ими создавались, не ими наполнялись содержанием и им не принадлежат. А раз так, то получается, что и государство не принадлежит людям, будучи отчуждено от них. Отсюда – социальная апатия, неверие в политические институты, всеобщий скепсис в обществе по отношению к своему будущему. Западные политологи ещё лет пять-семь назад назвали такое положение дел во взаимоотношениях политических институтов стран СНГ с населением феноменом "песочных часов". Это когда власть в обществе существует отдельно, сама по себе, а народ – сам по себе, а соединяет их узенький коридорчик шириной в несколько песчинок, невообразимо медленно пересыпающихся из одной части в другую, настолько медленно, что их можно считать практически не связанными друг с другом.

Мы убеждены, что ИС не должна (как, кстати, и Конституция) быть итогом политического спора, игры и противостояния между различными политико-финансовыми группировками в обществе. Она, прежде всего, должна быть итогом продуманных теоретических разработок, в результате которых, с учётом как мирового опыта построения консолидированных демократий, так и основных социальных слоёв нашего общества, должна быть найдена её оптимальная формула. Оптимальная в том смысле, чтобы адекватным способом мандаты в высший законодательный орган страны получали бы, с одной стороны, наиболее дееспособные и достойные граждане, а с другой – наиболее перспективные партии.

В заключение следует всё-таки отметить некоторые позитивные сдвиги на пути к институционализации партий в Украине. Это – назначение Виктора Ющенко премьер-министром с подачи парламента *(в настоящее время В.Ющенко не является главой правительства. Примечание редакции)*; образование чётких проправительственных групп фракций в парламенте (УНР-Батькивщина, ПРП-НРУ и т.п.); образование оппонирующей правительству связки СДПУ(о)-ДС как основы будущей серьезной политической силы, защищающей интересы всё более выпукло обозначаемой прослойки владельцев крупного капитала (хотя они сами о себе и говорят как о социал-демократах и центристах); и наконец, безусловно, полезные для общества разрушительные процессы в стане левых.

Предлагая данные новации, мы фактически тезис о неготовности ПК стран к демократии, о слабой институционализированности партийных систем в них дополняем более точным тезисом о том, что наше общество надо рассматривать не как гомогенное и единое целое, а как разношёрстную и крайне неоднородную среду, примерно столь же неоднородную, сколь не равны между собой доходы наших людей. Следуя из этой посылки, мы пытаемся, выделив основные кластеры в обществе, применять ИС не слепо ко всей стране, а адаптированно к каждому из выделенных кластеров. И тогда, по нашему мнению, внутри этих кластеров закон Duverger-а будет выполняться. Сейчас он не выполняется у нас не потому, что принципиально не может выполняться, как полагает Moser и другие исследователи, а потому, что ПК общество ещё очень рано рассматривать как одно целое, как единый общественный организм. Эти стереотипы восприятия общества, по понятным причинам сформировавшиеся у западных исследователей, не имеют ничего общего с тем, что в реальности представляют собой ПК страны, только начинающие свой нелёгкий путь к консолидированной демократии.

ПРИМЕЧАНИЯ

1. Duverger M. Political Parties. L., 1954.
2. Elections: Perspectives on Establishing Democratic Practices. United Nations, New York, 1997, 58 pp., c.27.
3. Evans G. & Whitefield S. Identifying the Bases of Party Competition in Eastern Europe. // British Journal of Political Science, 23, #4, 1993.
4. Huntington S.P. Political order in changing societies. New Haven, L., 1968.
5. Moser R. G. Electoral Systems and the Number of Parties in Postcommunist States. // World Politics, Vol. 51, #3, April 1999, pp.359-384, c.5-22.
6. Reeve A. & Ware A. Electoral Systems: a comparative and theoretical introduction. Routledge, London, NY, 1992, 190 p., pp.1-4.
7. White S., Rose R. & McAllister J. How Russia Votes NY, Gratham House, 1997, 135 p.
8. Голосов Г.В. Пределы электоральной инженерии: "смешанные несвязанные" ИС в новых демократиях. // ПОЛИС, 1997, №3, с.102-113, с.15-19.
9. Голосов Г.В., Шевченко Ю.Д. Независимые кандидаты и зависимые избиратели: влияние социальных сетей на электоральную политику в России. // ПОЛИС, 1999, №4, с.108-121, с.20-22.
10. Таагепара Р., Шугарт М.С. Описание избирательных систем. // ПОЛИС, 1997, №3, с.114-136. Главы из книги Taagepara R. & Shugart M.S. Seats and votes. The Effects and Determinants of Electoral Systems. New Haven, 1989, c.1-14.

Анатоль АСТАПЕНКА,
дацэнт, намеснік старшыні БСДГ

ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА БЕЛАРУСІ Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПЕРСПЕКТЫВЕ І ІХ УЗАЕМАСУВЯЗЬ З НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭЯЙ І НАЦЫЯНАЛІЗМАМ

Беларуская палітычная сітуацыя на мяжы трэцяга тысячагоддзя адметная тым, што ў параўнанні са сваімі суседнімі краінамі беларуская грамадзянская супольнасць мае вельмі слаба выражанае нацыянальнае аблічча. Ці можна наогул у такіх абставінах гаварыць пра існаванне беларускага нацыяналізму?

Па-першае вызначымся з разуменнем паняцця "нацыяналізм".

Найбольш аптымальны погляд на нацыяналізм ляжыць у спалучэнні ідэй, выпрацаваных заходнімі аўтарамі, і падыходаў рускіх рэлігійных філосафаў, якія ўзводзілі хрысціянскую любоў у ранг палітычнага прынцыпа. Зыходзячы з гэтага мы лічым, што для нацыяналізму характэрна наступнае:
- любоў да свайго народа;
- любоў да свайго краю;
- гонар за гісторыю свайго народа;
- павага і адчуванне адметнасці і непаўторнасці сваёй мовы;
- любоў да сваёй Айчыны, ці патрыятызм;
- вера ў Божае прызначэнне свайго народа;
- боль за няўдачы свайго народа і радасць за яго поспехі.

На нашу думку, хаця нацыяналізм у Беларусі не сфарміраваўся як дзяржаўная ідэалогія, як масавая свядомасць народа, ён мае перспектывы стаць такім у недалёкай будучыні. У канцы XX стагоддзя беларусы апынуліся ў становішчы французаў канца XVIII стагоддзя ці чэхаў пачатку XX стагоддзя. У наш час – эпоху развітых нацыянальных дзяржаў – беларусы з'яўляюцца адным з нямногіх у свеце народаў, нацыянальная ідэнтыфікацыя якіх яшчэ цалкам не сфарміравалася. Асноўныя прыкметы нацыі: агульнасць мовы, тэрыторыі і нацыянальнай дзяржавы – у Беларусі выглядаюць не лепшым чынам. І нездарма пра беларусаў доўгі час гаварылі як пра этнас, а не нацыю. У адрозненне ад сваіх продкаў, што жылі ў Вялікім княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) і ўяўлялі магутны народ, які не раз даваў адпор і Маскве і крыжакам, беларусы "Северо-Западного края" Расіі былі насельніцтвам са слаба выяўленымі нацыянальнымі прыкметамі. Пісьменнасці сваёй не было – яна толькі нараджалася (пачынальнікі – Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Багушэвіч, а потым Янка Купала і Якуб Колас), і не было нават адзінай назвы беларускага народа. Гучалі назвы "ліцвіны", "русіны", а найбольш – "тутэйшыя". А на Палессі казалі: " Мы не людзі, мы – паляшукі".

Аднак, нягледзячы на такую кволую нацыянальную свядомасць, к моманту бальшавіцкага перавароту 1917 года у беларусаў была створана свая пісьменнасць, прычым на аснове двух алфавітаў – лацініцы і кірыліцы, выпускалася свая газета – "Наша ніва", былі свае нацыянальныя паэты і пісьменнікі (Цётка, Я.Колас, Я.Купала, М.Багдановіч, Ш.Ядвігін і іншыя).

У гісторыі беларускага адраджэнцкага руху і звязанага з ім працэсам фармавання беларускай нацыі мы вылучаем чатыры перыяды. **Першая хваля** нацыянальнага адраджэння займае перыяд з 1861 г. па 1917 г. Перыяд ВКЛ намі не разглядаецца па прычыне таго, што ў тыя часы наогул яшчэ не пачаўся працэс фарміравання нацый у сучасным паняцці (магчыма, за выключэннем Англіі). Перыяд Вялікага княства Літоўскага (з XIII да XVI стагоддзя) – па нашай класіфікацыі – перыяд падзелу людзей па веравызнанні (формы манатэізму), па класіфікацыі Э.Геллнера – аграрны перыяд (перад-нацыянальны).

Гістарычна склалася так, што першым ідэалагічным вучэннем на Беларусі была сацыял-дэмакратыя, якая ўвасаблялася ў Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе (БСГ), ці проста Грамадзе. Гэтая партыя была створаная шляхам рэарганізацыі Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады (існавала з 1903 г.).

БСГ кіравалася дзвюма вельмі важнымі канцэпцыямі. Па-першае, яна выступала за сацыялізм, вызнавала марксізм, хаця і не мела зносінаў з расійскімі бальшавікамі. Па-другое – і гэты факт стаў вызначальным пры стварэнні БНР і БССР – вялікае месца ў праграме БСГ займала праблема ажыццяўлення нацыянальнай ідэі. Упершыню за ўсю гісторыю Беларусі ў складзе Расійскай Імперыі была створана праграма, дзе была выразна выказана ідэя аўтаноміі беларускіх зямель, аўтаноміі Беларусі ад Расіі. Хаця аўтаномія не прадугледжвала поўнай незалежнасці (Беларусь па праграме БСГ заставалася ў складзе Расійскай Імперыі), гэтая ідэя была на той час вельмі радыкальнай. Нітуючы пачатак і канец XX стагоддзя, можна сказаць, што абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь у 1991 годзе ёсць завяршэнне і ажыццяўленне ідэй, сфармуляваных у праграме БСГ.

Пасля рэвалюцыі 1917 года ў Беларусі існавала дзве галоўныя палітычныя партыі: БСГ, якая ў 1918 г. была ператвораная ў БСДП (Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю), і Камуністычная партыя Беларусі (КПБ).

Дзейнасць БСГ-БСДП непарыўна звязана з яе лідэрамі – Іванам і Антонам Луцкевічамі, Алесем Гаруном і іншымі. Самае галоўнае, што прынесла іх дзейнасць: праграма БСГ была рэалізаваная на практыцы фактам стварэння 25 сакавіка Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), праіснаваўшай, праўда, не доўга. Аднак да гэтага часу існуе ўрад БНР у эміграцыі (цяперашні прэзідэнт – Івонка Сурвіла).

Іншыя вынікі атрымаліся ад дзейнасці на Беларусі камуністаў (бальшавікоў). 1-га студзеня 1919 г. імі была ўтвораная БССР. Ёсць меркаванне, што штуршком для абвяшчэння БССР было папярэдняе ўтварэнне БНР.

У адрозненне ад цяперашніх часоў у 20-я гады жыццё Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вызначалася шырокім нацыянальным уздымам, усеагульнай беларусізацыяй. Афіцыйную ідэалогію і палітыку тагачасных бальшавікоў можна аднесці да нацыянал-камунізму. Аднак ужо з 1929 года пачалася новая эпоха, пачалося станаўленне культу асобы Іосіфа Сталіна, пачаліся жорсткія рэпрэсіі, пад якія трапілі не толькі іншадумцы (былыя сацыял-дэмакраты, нацдэмы), але і нацыянал-камуністы (Вацлаў Ігнатоўскі, Цішка Гартны і іншыя).

Гэта становіцца зразумелым, калі ўсвядоміць наступную схему фармавання нацыі-дзяржавы: кожная нацыя, якая суіснуе з дамінуючай нацыяй у адной дзяржаве, для дасягнення дзяржаўнай незалежнасці павінна прайсці тры фазы:

– супольнае жыццё малой нацыі з вялікай у адной дзяржаве (беларусаў-тутэйшых з рускімі);

– дасягненне аўтаноміі ў рамках адной дзяржавы. Фактычна БССР у складзе СССР можна лічыць у нейкай ступені аўтаномнай рэспублікай. Аднак гэтая аўтаномія вельмі ўмоўная, бо ў таталітарнай дзяржаве, якой быў СССР, ні аб якіх свабодах не магло быць і гаворкі;

– барацьба за незалежнасць і як вынік – здабыццё яе.

Беларусь, абыходзячы другую з адзначаных стадый, 25 сакавіка 1918 г. стала незалежнай дзяржавай – БНР, а яе заступніца БССР з 1 студзеня 1919 г. – "раўнапраўнай" рэспублікай у складзе СССР. На самой справе БССР не мела нават сапраўднай аўтаноміі. Адно што можна адзначыць – пэўную культурную самастойнасць Беларусі.

Другая хваля нацыянальнага адраджэння: 1918-1929 гады (БССР), 1921-1939 гады (Заходняя Беларусь).

Гэты перыяд можна назваць перыядам найбольш плённага развіцця беларускай нацыі. За досыць кароткі перыяд у галіне беларусізацыі было зроблена больш, чым за ўсё мінулае стагоддзе. Выйшлі першыя беларускія слоўнікі: у 1926 г. у Мінску выйшаў беларуска-расійскі слоўнік, складзены М.Байковым і С.Некрашэвічам; у 1924 г. у Коўна выйшаў расійска-беларускі слоўнік В.Ластоўскага; надрукаваныя таксама галіновыя слоўнікі па фізіцы, хіміі і іншых навуках. Навукова-даследчае жыццё віравала ў асяроддзі першай беларускай навуковай установы Інбелкульта – папярэдніка Акадэміі Навук. Расквітнела беларуская проза і паэзія. Сфарміравалася нацыянальнае тэатральнае мастацтва і народная творчасць.

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што к 1929 году на Беларусі амаль сфармавалася беларуская нацыя, хаця канчатковае завяршэнне гэтага працэсу не адбылося па вядомым прычынам. У той час з'явіліся і першыя тэарэтычныя працы, прысвечаныя беларускай праблематыцы. Асабліва трэба адзначыць ксяндза Адама Станкевіча, якім былі, па-сутнасці, закладзеныя асновы беларускага нацыяналізму.

Калі ў перыяд 20-х – 40-х гадоў ва Усходняй Беларусі ўсталяваўся камуністычны рэжым, то ў Заходняй панаваў капіталізм, які быў адносна больш лаяльным рэжымам і нават дазваляў шматпартыйнасць. Найбольш буйнай з беларускіх партый Заходняй Беларусі была БХДЗ (Беларуская хрысціянска-дэмакратычная Злучнасць), якой кіравалі Ян Пазьняк і ксёнз Адам Станкевіч. БХДЗ аб'ядноўвала ў сваіх шэрагах некалькі тысяч чалавек. Гэта былі галоўным чынам сяляне, а таксама збяднелая шляхта. Вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай беларускай думкі зрабіў ідэолаг БХДЗ А.Станкевіч, які надрукаваў шэраг ключавых кніг аб хрысціянстве, беларускай нацыянальнай ідэі і якога можна лічыць заснавальнікам беларускага нацыяналізму.

Акрамя БХДЗ у Заходняй Беларусі існавалі і іншыя партыі: БСДРП (Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя), БНФ (Беларускі народны фронт) і, нават, Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя.

У часы рэпрэсій галоўным абвінавачваннем, што выдвігалася дзеячам беларускай культуры, пісьменнікам, паэтам, мастакам, вучоным і іншай творчай інтэлігенцыі, было абвінавачванне ў "нацдэмаўшчыне", г. зн. у прыхільнасці да ідэалаў дэмакратыі і нацыянальнай ідэі – дакладней, да ўсяго нацыянальнага. Гэтая "нацдэмаўшчына" ўзводзілася амаль ў ранг нейкай ідэалогіі, варожай да сацыялістычных і камуністычных ідэй і наогул "да будаўніка камунізму". Але на самой справе "нацдэм" – гэта быў толькі ярлык, і ніякай тэорыі, канцэпцыі ці ідэалогіі нацдэмаўшчыны не існавала. Пад ярлык "нацдэма" маглі трапіць і былыя сацыял-дэмакраты з "Грамады", і хрысціянскія дэмакраты, што выехалі з Заходняй Беларусі у Савецкую Беларусь, і нацыянал-камуністы, і нават звычайныя беларускамоўныя пісьменнікі і паэты.

Слабасць нацыянальнай свядомасці беларусаў у часы Расійскай Імперыі, негатоўнасць утварыць сваю незалежную дзяржаву далі свое вынікі і ў даваеннай БССР, і ў Заходняй Беларусі, якія не здолелі сфармуляваць сваю нацыянальную ідэю. Творы найбольш грунтоўных мысліцеляў гэтай эпохі А.Станкевіча, В.Ластоўскага, Я.Лёсіка, Я.Самойлы не паспелі стаць усенародным набыткам – іх аўтары былі рэпрэсіраваныя, а кнігі – забароненыя.

У сувязі з гэтым гаварыць аб існаванні, прынамсі, палітычнага нацыяналізму і тым больш ідэалогіі нацыяналізму ў даваеннай БССР заўчасна. Аднак нацыянальны рух 20-х гадоў быў ужо асновай будучай нацыянальнай дзяржавы і канцэпцыі беларускага нацыяналізму, ажыццяўленню чаго перашкодзіў культ асобы, які прыпыніў гэтыя працэсы да эпохі перабудовы, што пачалася напрыканцы 80-х гадоў.

На працягу панавання савецкай улады фактычна адзінай ідэалогіяй у БССР была дзяржаўная, якую несла камуністычная партыя – КПБ, філіял саюзнай КПСС. З іншых ідэалагічных канцэпцый можна адзначыць толькі ідэі, выкладзеныя ў праграмах даваенных партый Заходняй Беларусі – БХДЗ і БСДП. Трэба адзначыць, што ні ліберальныя, ні кансерватыўныя традыцыі не былі вядомыя беларусам як у імперскай Расіі, так і ў Рэчы Паспалітай і ў БССР.

Гаворка аб гісторыі нацыянальнага руху на Беларусі была б не поўнай, калі не адзначыць хвалю нацыянальнага адраджэння пад час нямецкай акупацыі. Афіцыйна амаль усе арганізацыі нацыянальнага кшталту, якія ўзніклі ў 1941-1944 гадах на тэрыторыі Беларусі і якія не падтрымлівалі камуністаў, лічацца калабаранцкімі. Але заўсёды забываецца іншы бок гэтых падзей: вялікая частка нацыянальна свядомых беларусаў імкнулася да стварэння такой Беларусі, якая была б незалежнай як ад фашысцкай Германіі, так і ад камуністычнага Савецкага Саюза. Хаця большасць з гэтых людзей верылі ў сілы свайго народа і марылі аб яго лепшай будучыні, нельга забывацца і пра тых, што пайшлі на адкрытую здраду і сталі на бок Рэйха.

Другая сусветная вайна парадзіла **трэцюю хвалю** беларускага адраджэння. Ужо ў 1941 годзе была створаная Беларуская нацыянальная Самапомач, затым узнік Саюз беларускай моладзі (СБМ), арганізаваная Беларуская незалежніцкая партыя (БНП) і паўстала Беларуская аўтакефальная царква. У 1942 годзе на тэрыторыі акупаванай Беларусі быў арганізаваны шырокі нацыянальны рух – Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР) на чале з Р.Астроўскім. З дапамогай БЦР была нават створаная свая нацыянальная армія – Беларуская Краёвая Абарона – у колькасці 23 тысяч чалавек. БЦР праводзіла вялікую асветніцкую і культурную працу. Былі адчынены беларускія школы, народныя бібліятэкі, адноўлена праца Мінскага Беларускага тэатру. Беларускімі кампазітарамі было напісана звыш 60 музычных твораў, сярод якіх балет кампазітара А.Туранкова "У лясным пушчары", аперэта М.Шчаглова на лібрэта Н.Арсеньевай "З выраю"; выдадзены зборнікі вершаў Н.Арсеньевай, Т.Лебеды, Л.Случаніна.

Кульмінацыяй дзейнасці БЦР стаў II Усебеларускі Кангрэс, што прайшоў у Мінску 27 чэрвеня 1944 г. Хаця кангрэс праходзіў у акупаваным Мінску, ён меў надзвычай вялікае прадстаўніцтва – дэлегаты былі ад усіх этнаграфічна беларускіх мясцін колькасцю 1039 асобаў.

Кангрэс асудзіў бальшавіцкі рэжым і ануляваў ўсе пастановы і законы, прынятыя савецкай уладай і палякамі. У заключным слове прэзідэнт Кангрэсу Яўхім Кіпель сказаў: "Сённяшнім сваім актам наш народ давёў усяму Свету, што ён не хоча ні маскоўскае, ні польскае апекі. Усе пастановы аб выхадзе з так званага Савецкага Саюзу і аб ануляванні маскоўска-польскіх дамоваў аб Беларусі прыняты аднагалосна. А гэта вельмі важна! Сярод тысячы двухсот чалавек не знайшлося ні аднаго, які б хацеў звароту бальшавікоў, які б хацеў панавання польскіх паноў на Беларусі. Бясспрэчна, гэта воля не толькі дэлегатаў – гэта воля ўсяго беларускага народу!"

Дэлегаты Кангрэса былі настроены вельмі рашуча. Але ўзнікае пытанне: чаму ж ніхто з прысутных на Кангрэсе не здолеў рэальна ацаніць свае шанцы ў барацьбе за незалежнасць Бацькаўшчыны? Яны ж былі на 100 адсоткаў нулявымі! Усе згаданыя падзеі праходзілі ў тыя часы, калі Савецкая Армія гнала нямецкіх акупантаў і няўзабаве вызваліла Мінск. Пра якую незалежную Беларусь у такіх умовах можна было гаварыць? Не дзіва, што амаль усе ўдзельнікі Кангрэсу былі ці закатаваныя савецкім НКУС, ці скончылі сваё жыццё ў эміграцыі. А сярод іх былі такія вядомыя людзі як генерал К.Езавітаў (як напісана ў "Матэрыялах Кангрэсу..." – "загінуў на бальшавіцкай шыбеніцы ў 1947 г."); славутыя паэткі Ларыса Геніюш і Наталля Арсеньева (абедзьве былі рэпрэсіраваныя); вядомы ўрадавец Народнага Камісарыяту Асветы БССР Аўген Калубовіч, які напісаў у эміграцыі вядомую зараз кнігу "Айцы Беларусі і іх лёс"; інжынер Іван Касяк – напісаў у эміграцыі кнігу "З гісторыі Беларускай аўтакефальнай царквы"; дацэнт БДУ, аўтар шматлікіх падручнікаў і навуковых прац Яўхім Кіпель і шмат іншых знакамітых людзей, імёны якіх толькі цяпер вяртаюцца з забыцця.

Такім чынам, у выніку шматлікіх рэпрэсіўных акцый на працягу 20-х – 50-х гадоў да моманту гарбачоўскай перабудовы – а менавіта з гэтых часоў пачынаецца новы гістарычны працэс у СССР – Беларусь падышла амаль абезгалоўленай, не маючай моцнай нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, не маючай усведамлення сябе як нацыя і дзяржава. Дзве хвалі масавага тэрору – рэпрэсіі 30-х гадоў і пераслед "нацыяналістаў" пасля 1944 года – далі свае сумныя вынікі.

З прыходам гарбачоўскай перабудовы пачалася новая эпоха ў палітычных працэсах у Беларусі. У 1991 г. Беларусь атрымлівае незалежнасць. Атрымлівае нечакана, пры тым зусім не гатовая да яе, але стаўшая самастойнай, "як і ўсе", – як іншыя рэспублікі СССР, большасць з якіх марыла аб гэтай самастойнасці і лічыла сваё ўваходжаннне ў склад Саюза акупацыяй сваёй краіны Расіяй (напрыклад, прыбалты).

Галоўная рыса новага перыяду (90-я гады XX ст.) – падзенне аўтарытэта і ўсеабдымнасці камуністычнай партыі, падзенне таталітарнай сістэмы. Новы перыяд прынёс шматпартыйнасць і станаўленне новых (для былой БССР) палітычных ідэалогій.

Распад СССР – яскравая праява законаў тэорыі іерархічных многаўзроўневых сістэм (далей – ІМС), гэты факт азначае пераход да грамадства новага ўзроўню праз разбурэнне старога грамадства. Вядома, што сістэма, якае не мае зваротнай сувязі, самаразбураецца. Менавіта такой сістэмай была таталітарная дзяржава СССР. Яна характарызавалася нерухомай камуністычнай ідэалогіяй, разлічанай на механізм узброенага кіравання, а не на дакладныя веды і майстэрства. Гэтая ідэалогія стала прычынай разбурэння дзяржаўнай улады. Доўгачасовы адбор у складзеныя ёю ўстановы кіравання, куды ўваходзяць і установы кіравання мастацтвам, навукай і вытворчасцю, зрабіў уладу недзеяздольнай і накіраванай супраць уласнай падтрымкі.

Тэорыя ІМС разглядвае дзяржаву як іерархічную многаўзроўневую сістэму з невялікай колькасцю ўзроўняў, чые звязаныя выразы разгортваюцца далей і на ўсіх кроках разгортвання хутка набываюць зразумелыя і годныя ў карыстанні азначэнні. Без усведамлення ладу і руху ўсіх узроўняў дзяржавы беларускае заканадаўства было недзеяздольным, і толькі распад СССР і абвяшчэнне незалежнасці далі Беларусі магчымасць стварыць свой рухомы светапогляд, які фармаваўся на пачатку праз праграмы маладых беларускіх партый.

Шматпартыйнасць разгарнулася на Беларусі з пачатку 90-х гадоў, на цяперашні момант у краіне прадстаўлены фактычна ўсе асноўныя палітычныя плыні, што існуюць у краінах Заходняй і Усходняй Еўропы. У 1988 г. паўстаў Беларускі Народны Фронт, які паставіў сваёй мэтай дэмакратызацыю грамадства і нацыянальнае адраджэнне. У1990 г. быў прыняты Закон аб мовах, згодна якому беларуская мова станавілася адзінай дзяржаўнай мовай. Пасля абвяшчэння Рэспублікі Беларусь была прынята нацыянальная сімволіка – герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг. Пачалася **чацвёртая хваля** нацыянальнага адраджэння, якая доўжылася з1988 па 1996 год – год рэферэндума, пасля якога была вернута ў некалькі мадыфікаваным выглядзе ранейшая савецкая сімволіка і быў прыняты закон аб дзвюх дзяржаўных мовах: беларускай і рускай, што адмоўна адбілася на распаўсюджанні і развіцці беларускай мовы. Усё ж за гэты кароткі прамежак часу было зроблена вельмі шмат. Адкрываліся беларускія класы і школы, няўхільна беларусізавалася вышэйшая школа, упершыню адкрыта друкаваліся творы нацыянал-дэмакратаў часоў культа асобы, тых, хто доўгі час насіў ярлык "ворага народа". Грамадзянам Беларусі нарэшце сталі даступныя творы Язэпа Лёсіка, Вацлава Ластоўскага, Ларысы Геніюш, Усевалада Ігнатоўскага... Стала магчымым выдаць кнігу "Па слядах аднаго міфа" сучаснага гісторыка Міколы Ермаловіча, якая была пад забаронай, а яе аўтар не меў уваходу ў акадэмічныя інстытуты.

Здавалася б, што абвяшчэнне незалежнасці Беларусі на фоне такога ўздыму нацыянальнага адраджэння дадасць не толькі больш магчымасцей для беларускага руху, але і зробіць працэс фарміравання беларускай нацыі-дзяржавы неадваротным.

Але ў 1991 годзе – годзе абвяшчэння незалежнасці шэрагам постсавецкіх рэспублік – Беларусь была, відавочна, адзінай з іх, якая не была гатовая да дзяржаўнай незалежнасці. Калі у жыхароў Прыбалтыкі ідэя сваёй дзяржавы жыла на ўзроўні самага занядбалага абывацеля, то для беларусаў яна была незразумелай і асацыявалася хутчэй з даўнімі, але не забытымі гулагаўскімі лагерамі.

Зыходзячы з прыведзенай вышэй канцэпцыі ўтварэння нацыі-дзяржавы, кожная нацыя павінна заваяваць свой суве-

ДИСКУССИЯ

рэнітэт, перад гэтым прайсці шлях аўтаноміі і вельмі захацець незалежнасці. Так было ва ўсіх рэспубліках былога СССР, акрамя Беларусі. Працэс утварэння нацый-дзяржаў, які пачаўся для большасці народаў, як мы вышэй адзначалі, яшчэ ў XIX стагоддзі, дасягнуў кульмінацыі ў канцы ХХ-га стагоддзя. Ідэалогія нацыяналізму запанавала паўсюдна. Але ў Беларусі гэтая ідэалогія не стала масавай. Носьбітамі яе стала невялікая частка народа, якая і стварыла БНФ.

Напачатку, у 1988 годзе, ідэі дэмакратыі і нацыянальнага адраджэння крочылі побач. Недахоп таго і другога ў грамадстве, шматгадовая адсутнасць свабоды слова і друку, ганебны стан беларускай мовы і нацыянальнай культуры нечакана, пасля 30 кастрычніка 1988 года – часу правядзення знакамітых "Дзядоў", скончыліся ўзнікненнем шырокага руху за дэмакратыю – Беларускага Народнага Фронту (БНФ).

БНФ з самага пачатку аказаўся на вяршыні палітычных працэсаў у Беларусі і задаваў пэўны тон у дзяржаўнай палітыцы, карыстаючыся ў вялікай ступені разгубленасцю камуністаў і працэсам распаду СССР. Аднак з 1995 году, пацярпеўшы паразу на выбарах у ВС, роля і аўтарытэт БНФ у грамадстве пачалі імкліва падаць.

На нашую думку, галоўныя памылкі БНФ былі наступныя:

1. Пераацэнка ролі нацыянальнага адраджэння. Узяўшы за ўзор станаўленне прыбалтыйскіх краін, дзе нацыянальнае самавызначэнне дамінавала, БНФ не ўлічыў менталітэт свайго народа, далёкі ад нацыянальнай дамінанты, і згубіў большасць электарату. БНФ, хаця і ўзяў сабе назву "народны", быў у сваёй большасці вельмі далёкім ад большай масы беларускага народа. Кіраўніцтва БНФ, якое складалася галоўным чынам з нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, вылучыла на пярэдні план беларускую нацыянальную ідэю, не ўлічыла матэрыяльны чыннік і слабую беларускую эканоміку. Палітолаг У.Роўда слушна адзначае, што Беларусь нельга назваць нацыянальнай дзяржавай – незалежнасць яна атрымала раней, чым скончыўся працэс фармавання нацыі [1].

2. Увядзенне ў беларускую мову правапісу Браніслава Тарашкевіча (тарашкевіцы). Тарашкевіца была ўведзена і ў абіход, і ў прэсу, і ва ўнутранае справаводства, што аказалася заўчасным. Гэты акт адпіхнуў ад БНФ вялікую колькасць беларускамоўных настаўнікаў, літаратараў і пісьменнікаў. Наогул, на момант пачатку 90-х гадоў ХХ-га стагоддзя тарашкевіца амаль нідзе ва ўжытку не захавалася. Ёю карысталіся толькі беларускія эмігранты ды невялікія дыялектныя групы, тэрытарыяльна блізкія да Польшчы.

3. Нагнятанне варожасці да Расіі паступова складала ў электарата імідж БНФ, як фашысцкай арганізацыі. А дзякуючы шматлікім выступленням лідэра БНФ Зянона Пазьняка супраць Расіі (напрыклад, артыкул "О русском империализме", надрукаваны ў студзені 1994 года ў "Народнай газеце"), БНФ адштурхнуў ад сябе вялікую масу простых людзей, якія даўно прызвычаіліся жыць разам з рускімі і якім была незразумелай пазьнякоўская нялюбасць да Масквы. У Беларусі жыве каля 13% рускіх, яе жыхары маюць моцныя сувязі з Масквой і, што галоўнае, – у вялікай колькасці грамадзян Беларусі з гадамі склаўся нават рускі менталітэт. І, зразумела, палітыка ў адносінах да нашай вялікай суседкі – Расіі – павінна быць зусім іншай, больш гібкай і станоўчай.

4. Амбіцыі лідэра БНФ З.Пазьняка, і як вынік – за 10 гадоў (з 1989 па 1999 год) склад БНФ амаль цалкам аднавіўся. Нязадольнасць Пазьняка прыслухоўвацца да думак паплечнікаў прывяла да таго, што ад кіраўніцтва БНФ адышоў шэраг вядомых палітыкаў: Валеры Сядоў (з 1992 г.), Валянцін Голубеў, Вера Чуйко, Віктар Івашкевіч (пасля 1995 г.) і многія іншыя. Гэтая эгацэнтрычная пазіцыя прывяла да расколу БНФ улетку 1999 г., пасля якога частка "пазьнякоўскага" БНФ засталася без галоўнай інтэлектуальнай сілы, з якой пачынаўся Фронт – Юрыя Хадыкі, Вінцука Вячоркі і Лявона Баршчэўскага. Заявілі аб сваім неўваходжанні ў новую хрысціянска-кансэрватыўную партыю З.Пазьняка і такія вядомыя людзі як Рыгор Барадулін і Анатоль Грыцкевіч. Усе яны засталіся ў ранейшай партыі БНФ.

Пасля расколу БНФ у 1999 годзе на дзве незалежныя палітычныя структуры: партыю БНФ (старшыня Вінцук Вячорка) і Кансерватыўна-хрысціянскую партыю (КХП) – партыя БНФ (старшыня Зянон Пазьняк) – сумарны аўтарытэт абодвух БНФ трошкі зменшыўся, хаця асноўная маса электарату засталася.

За 10 год пабудовы дэмакратыі ў незалежнай Беларусі акрамя БНФ, што была ў 1989 годзе адзінай апазіцыйнай палітычнай сілай, к 2000 году вырас шэраг іншых партый і грамадскіх рухаў. Пасля перарэгістрацыі партый у 1998 годзе ў краіне налічвалася 18 палітычных партый.

Па характару сваёй дзейнасці партыі дзеляцца на тры групы:

1. Партыі, якія падтрымліваюць палітыку прэзідэнта і ўрада. Да іх адносяцца: Камуністычная партыя Беларусі (старшыня В.Чыкін), Беларуская патрыятычная партыя (старшыня Д.Улаховіч), Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды (лідэр – Л.Сечка), Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (старшыня А.Нятылькін), Аграрная партыя, Рэспубліканская партыя.

2. Партыі, апазіцыйныя прэзідэнту і ўраду: партыя БНФ (старшыня В.Вячорка), КХП – партыя БНФ (З.Пазьняк і в.а. старшыні Ю.Беленькі), Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада (БСДГ) (старшыня С.Шушкевіч), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) (старшыня М.Статкевіч), Аб'ядная грамадзянская партыя (старшыня А.Лябедзька), жаночая партыя "Надзея" (старшыня В.Палевікова), Партыя працы (старшыня Л.Лемяшонак).

3. Партыі, якія "хістаюцца", не прымкнулі ці выйшлі з блоку апазіцыйных партый: Ліберальна-дэмакратычная партыя (ЛДП, старшыня С.Гайдукевіч), Партыя камуністаў Беларуская (ПКБ, старшыня С.Калякін) і яшчэ некалькі дробных партый. Адзначым, што ЛДП на працягу 1999-2000 гадоў уваходзіла ў Кансультацыйны савет апазіцыйных палітычных партый (далей – КС ОПП). Аднак пазней, прыняўшы рашэнне аб удзелу ў выбарах у Палату прадстаўнікоў, ЛДП часова прыпыніла сваю дзейнасць у КС ОПП. Зараз яна яго аднавіла. Яшчэ раней (на выбарах у Вярхоўны Савет 1995 г.) партыі С.Гайдукевіча і С.Калякіна былі вядомыя як прапрэзідэнцкая.

Па рэйтынгу папулярнасці першынства мае жаночая партыя "Надзея". Кожная з партый БНФ пасля расколу набірае крыху больш 2%. Адносна высокі рэйтынг мае БСДГ, што, відавочна, абумоўлена вялікай папулярнасцю Станіслава Шушкевіча, які ўзначальвае партыю. Ніжэй мы прыводзім табліцу рэйтынгу палітычных партый па дадзеных Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў (першая палова 2000 года):

Калі б на Беларусі сёння адбыліся парламенцкія выбары, за прадстаўніка якой з партый Вы б прагаласавалі?, %	Сакавік 2000 г.
ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ	
Аб'ядная грамадзянская партыя (С.Багданкевіч)	4,5
Кансерватыўна-Хрысціянская партыя – партыя БНФ (З.Пазьняк)	2,2
Беларускі народны фронт "Адраджэнне" (В.Вячорка)	2,1
Беларуская Сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) (М.Статкевіч)	2,0
Беларуская Сацыял-дэмакратычная Грамада (С.Шушкевіч)	4,2
Партыя працы (А.Бухвостаў)	1,7
Партыя жанчын «Надзея» (В.Палевікова)	5,8
Партыя камуністаў Беларуская (С. Калякін)	2,4
Камуністычная партыя Беларусі (В.Чыкін)	3,3
Ліберальна-дэмакратычная партыя (С.Гайдукевіч)	1,8
Беларускае аб'яднанне «Яблоко»	1,6
Іншыя партыі	1,2

Вынікі апытання сведчаць аб нявысокай палітычнай культуры беларускіх грамадзян. Высокі рэйтынг жаночай партыі "Надзея" тлумачыцца толькі тым, што гэтая партыя мела на мэце навіта жаночая, бо аніякіх істотных палітычных дзеянняў гэтая партыя не правяла.

На Беларусі *камуністычная ідэалогія* прадстаўлена дзвюма партыямі КПБ (падтрымлівае прэзідэнта) і ПКБ (яе можна аднесці да трэцяй групы).

Сацыял-дэмакратычная ідэалогія – найбольш папулярная ў Беларусі. Адпаведных партый на Беларусі – 3 (партыі, у назве якіх ёсць словы сацыял-дэмакратычная). Гэта – БСДПНЗ (Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя Народнай згоды); БСДГ (Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада) і БСДП (НГ) (Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада)). Нягледзячы на блізкасць назваў, усе гэтыя партыі маюць розныя погляды на беларускую палітыку. Першая з іх прытрымліваецца афіцыйнага, прэзідэнцкага курсу, і дзейнасць партыі не выходзіць за рамкі "згоды з урадам", БСДП з'яўляецца правацэнтрысцкай партыяй, а БСДП (НГ) – партыя больш левага накірунку, утвораная ў выніку аб'яднання БСДГ (зарэгістраваная ў 1991 г., першы старшыня М.Ткачоў) і Партыі народнай згоды.

Акрамя гэтых партый да сацыял-дэмакратычнага накірунку адносяць сябе Партыя жанчын "Надзея", Беларуская партыя працы, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці.

Ідэалогія нацыяналізму. У вялікай ступені яна стаіць у аснове праграм абодвух БНФ, ёй нададзена значнае месца ў БСДГ. Цалкам на пазіцыях нацыяналізму стаяла не падаваўшая на перарэгістрацыю 1998 года ў Міністэрства юстыцыі Беларуская нацыянальная партыя (БНП), якая ўзвяла прынцып нацыяналізму ў ранг галоўнага праграмнага прынцыпа. У праграме БПН было запісана: "Нацыяналізм – лепшая духоўная якасць асобы чалавека. Надышоў час вярнуць гэтаму слову яго спрадвечны станоўчы сэнс. Нацыяналізм – гэта адданасць сваёй нацыі, нацыяналізм – гэта змаганне нацыі за яе волю і незалежнасць, за яе духоўную і фізічную моц, за права нацыі быць роўнай сярод роўных".

Ідэалогія лібералізму – аснова праграмы Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) і вызнаецца таксама Ліберальна-дэмакратычнай партыяй (ЛДП). Характэрна, што ў сацыяльным складзе абедзьвух партый дамінуюць прадстаўнікі бізнесу, прадпрымальнікі. Аднак шчыльных кантактаў партыі не маюць.

Ідэалогія кансерватызму. На Беларусі адсутнічаюць партыі, якія б насілі такую назву, няма і партый, якія б суцэльна кіраваліся ідэалогіяй кансерватызму. Для той жа КХП – партыі БНФ галоўны прынцып не ў хрысціянскай дэмакратыі і не ў кансерватызме, ён цалкам уключаны ў паняцце "нацыянальна-вызвольны рух".

У прынцыпе, адсутнасць кансерватызму на Беларусі зразумелая. Яна абумоўлена разрывам векавых традыцый, масавай адсутнасцю нацыянальнай свядомасці беларусаў і іншых неабходных кампанентаў, уласцівых кансерватызму.

Ёсць, аднак, сярод беларускіх аналітыкаў і такія, якія спрабуюць сканструяваць мадэль беларускага ліберальнага кансерватызму. На наш погляд, гэта заўчасна [2].

Хрысціянска-дэмакратычная ідэалогія. Ніводная з партый, якія прайшлі перарэгістрацыю ў 1999 г. і пазней, не носіць назвы такога кшталту. Але трохі раней (да перарэгістрацыі) існавала тры партыі хрысціянска-дэмакратычнага накірунку: Беларуская хрысціянска-дэмакратычная Злучнасць (БХДЗ), Хрысціянска-дэмакратычны выбар (ХДВ) і Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя (БХДП). (Апошняя ўтварылася ў свой час у выніку раскола БХДЗ – першай партыі такога накірунку.) Усе гэтыя партыі мелі малы аўтарытэт у грамадстве, былі маласлікія і заканамерна зніклі.

Сярод іншых партый ідэі хрысціянскай дэмакратыі прысутнічаюць у праграмах БНФ, КХП – партыі БНФ, БНП, а таксама БСДГ.

Чаму ж атрымалася так, што найбольш уплывовыя на Захадзе ідэі хрысціянскай дэмакратыі, амаль не ўспрымаюцца ў Беларусі? Адказ просты. Па-першае – гэта слабасць шматпартыйнай сістэмы наогул. Па-другое, за гады панавання камуністычнага рэжыму і манаполіі камуністычнай ідэалогіі быў выхаваны грамадзянін з атэістычным светапоглядам. Для шырокіх мас людзей хрысціянства ў палітычным жыцці не ўспрымаецца, як не ўспрымаецца рэлігія наогул.

Тым не менш, вялікі колькасны рост царкоўных прыходаў усіх канфесій надае надзею на лепшую будучыню хрысціянскай дэмакратыі ў Беларусі.

Чаму ж у 90-я гады ХХ ст. не з'явілася моцная хрысціянская-дэмакратыя, а тыя кволыя парасткі хэдхкаў, увасобленыя ў партыях Беларуская Хрысціянска-дэмакратычная Злучнасць ці Хрысціянска-дэмакратычны выбар, хутка трапілі ў нябыт? Некаторыя тлумачаць гэта тым, што Беларусь з'яўляецца шматканфесійнай краінай, што перашкаджае стварэнню моцнай хрысціянска-дэмакратычнай партыі. Такі погляд цалкам памылковы.

Па-першае, і ў 30-я гады Заходняя Беларусь была шматканфесійнай, але Ян Пазьняк і Адам Станкевіч кіравалі моцнай хрысціянска-дэмакратычнай партыяй, якая мела сваю салідную газету "Беларуская крыніца". Акрамя таго, у наш час не існуе аднаканфесійных краін. Напрыклад, у Германіі некалькі канфесій, і пры гэтым няма перавагі якой-небудь аднОй: каталікаў і пратэстантаў (лютэран) прыкладна пароўну. Тым не менш, творца "нямецкага цуда" Людвіх Эрхард быў хрысціянскім дэмакратам, а

